У Беларусі намалочана ўжо больш за 6 мільёнаў тон збожжа. Будзем з хлебам!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадо...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

№ 65 (4420)

20 жніўня 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ТОЧКА ЗРЕНИЯ



Александр ФЕДУТА

Получите Глазьева...

Советника президента Российской Федерации Сергея Глазьева назначили на пост министра в постоянную комиссию Евро-Азиатского Экономического союза. Того самого «таежного союза», который по праву считается любимым интеграционным проектом Владимира Путина: при Путине ЕврАзЭС начали строить, при нем, вероятно, и закончат. Это не Союзное государство, но втроем (поначалу) с Казахстаном начинали, а потом и Армения с Кыргызстаном подтянулись. Так что назначение Сергея Юрьевича на высокий пост и нас касается. Нас все-таки «интегрировать» будут.

Примечательна и фигура данного деятеля. Глазьев начинал свою карьеру в правительстве Егора Гайдара, сначала в должности первого заместителя министра, а потом и министра внешнеэкономических связей. Но Гайдар перестал шагать впереди российского правительства, и Глазьев вовремя перестроился в другую колонну: стал одним из лидеров пресловутого Конгресса русских общин, а затем партии «Родина», которой руководил совместно с другим деятелем – Дмитрием Рогозиным, будущим куратором российского ВПК. Избирался он и в Государственную Думу, где возглавлял некоторое время комитет по экономике.

В этом качестве в 1996 году и давал он мне интервью для «Белорусской деловой газеты», где я в то время работал. Интервью было мало чем интересно – сейчас, спустя годы, – но тогда вовсю обсуждались планы Александра Лукашенко занять кремлевский престол, о чем я Сергея Юрьевича и спросил. Тем более что он и сам повод для этого дал: рассуждал о величии Богдана Хмельницкого, положившего Украину под ноги России и тем самым вошедшего в историю. (Нет, конечно, Глазьев точно знал, что Украина – не Беларусь, но другого примера успешного «интегратора» ему просто не подвернулось.)

И вот тогда я и задал ему вопрос: а если наш, белорусский, Богдан Хмельницкий возжелает надеть на себя шапку Мономаха – что тогда? И лица почтенного думского деятеля просто побагровело от хохота:

– Этого не может быть! Этого не может быть!

В той давней публикации после этих слов в скобках стояла ремарка интервьюера: «Смеется».

Тогда он действительно смеялся.

Потом пришлось плакать нам. И не только нам.

Если кто-то не знает, именно Глазьев в должности заместителя руководителя ЕврАзЭС (тогда еще не Союза, но Сообщества) настоял на переносе таможенной границы объединения на внешние рубежи Беларуси и Казахстана, тем самым расширив таможенное пространство России за счет наших территорий. Дело осталось за малым – перевести собственно таможенные структуры Беларуси в подчинение надгосударственных. Это и есть то, что является главным пунктом в меморандуме Дмитрия Козака, с которого и началось нынешнее противостояние Минска и Кремля. Фактически Глазьева, человека напористого и крайне деятельного, ради этого, как мне кажется, и назначили.

Кстати, у него есть замечательный партнер по работе в данном направлении. Михаил Бабич – а вы уже о нем позабыть успели? А забывать не стоит. Обиженный холодным приемом в Беларуси бывший посол сегодня занимает пост заместителя министра экономического развития и торговли России, курируя в этой должности вопросы интеграции и таможенного сотрудничества.

Да, уважаемые читатели, вы меня правильно поняли. Сейчас они вдвоем таможенное пространство, не исключено, и постараются переформатировать – как раз накануне президентских выборов в Беларуси.

А чтобы уже никто не сомневался в методах, которыми в последнее время привык руководствоваться Сергей Глазьев, напомню: в должности советника президента России именно он осуществлял контакты с будущим руководством так называемых ДНР и ЛНР, а также Крыма на начальном этапе оккупации. И соответствующие распечатки телефонных переговоров, а заодно и аудиозапись оных, в интернете имеются.

Так что в причинах назначения Глазьева сомневаться не приходится: его поставили на новый пост, чтобы он организовал процесс «дожатия» Александра Григорьевича до нужной кондиции. Это его, думаю, истинное назначение. Превратить возмущающегося давлением белорусского президента в подконтрольного гетмана. Как минимум – отобрать таможню вместе с ее добром.

А вы Бабич, Бабич!

Какого вам Бабича еще нужно? Вот, получайте Глазьева. И посмейте не согласовать!

КАДРЫ

На новыя пасады!

Учора Аляксандр Лукашэнка прызначыў:

Кунцэвіча Андрэя Міхайлавіча – намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт таксама даў згоду на прызначэнне:

Захарэнкі Васіля Аляксеевіча – старшынёй Бялыніцкага райвыканкама;

Сцяпанава Мікалая Уладзіміравіча – старшынёй Дрыбінскага райвыканкама;

Яфімчыкава Аляксандра Аляксеевіча – старшынёй Чавускага райвыканкама;

Вежнаўца Івана Валер'евіча – першым намеснікам міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю;

Канстанціновіч Аксаны Валер'еўны – намеснікам міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю;

Малашкі Валерыя Анатольевіча – намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

ЧП

Минск был на грани нервного срыва

Преступников нужно найти и наказать по всей строгости закона.

Вчера столица жила как на вулкане. Сначала около 8 утра в милицию обратились представители гостиниц «Беларусь» и «Гарни»: им на почту пришли сообщения о минировании. К гостиницам тут же выехали саперно-пиротехнические и следственно-оперативные группы МВД.

Через некоторое время за такой же помощью обратились минские гостиницы «Юбилейная» и «Виктория Олимп». Затем тревогу забили Национальный аэропорт Минск, столичный железнодорожный вокзал, а также его гостиница. После обеда в подобной ситуации оказались торговые центры «Галерея Минск», «Галилео», «Дана Молл», «Столица» и бизнес-центр «Рубин Плаза».

Это уже походило на хорошо спланированный акт агрессии, который должен был вызвать, пожалуй, настоящий массовый психоз в городе. И, конечно, у многих нервы были перенапряжены. Пришлось эвакуировать в общей сложности более двух тысяч человек. Но после проверки информация о тотальном минировании общественных мест не подтвердилась ни в одном случае, сообщил Следственный комитет.

Сейчас правоохранительные органы устанавливают обстоятельства произошедшего. Возбуждено уголовное дело о заведомо ложном сообщении об опасности (ч.1 ст.340 Уголовного кодекса). Но злоумышленника пока не нашли. Хотя во что бы то ни стало нужно найти и наказать по всей строгости закона.

С начала года Следственный комитет возбудил 35 уголовных дел о заведомо ложных сообщениях об опасности – за это предусмотрена уголовная ответственность, которая наступает с 14 лет. Правда, установили только 14 лиц, причастных к таким сообщениям (по шести уголовным делам уже есть обвинительный приговор). Кроме того, с преступника взимаются деньги, которые экстренные службы затратили на проверку. Это суммы немалые, но, как видите, ничего не останавливает электронных преступников, которых обуревает жажда разрушения.

Виктория ДРОЗД.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

Сіла «Народнай Волі» – у народзе!

Што і казаць, газета тады адыгрывае сваю ролю, калі яна мае ўплывовасць на грамадства, на дзяржаўную ўладу. Вядома ж, чым большы тыраж выдання, тым большая яго папулярнасць, а значыць, і ўплывовасць. Вось чаму рэдакцыя "Народнай Волі" глыбока зацікаўлена ў тым, каб чытацкая аўдыторыя не змяншалася, а расла.

Летні сезон на зыходзе, час адпачынкаў заканчваецца – і вельмі важна, каб была аднаўлена падпіска з боку тых, хто з-за часовага пераезду на лецішча альбо з-за вандровак па замежжы спыняў яе на месяц-два. Нагадваем: каб зноў атрымліваць "Народную Волю" з 1 верасня, трэба аднавіць падпіску да 28 жніўня. Вас чакаюць у паштовых аддзяленнях і ў спецыялізаваных пунктах "БелДруку". Можна гэта зрабіць і не пакідаючы дом. Заходзьце, калі ласка, на сайт Belpress.by і праводзьце аплату праз сістэму "Расчет" (АРІП) на верасень–снежань (альбо на любы тэрмін).

Карыстаючыся нагодай, у чарговы раз звяртаемся і да тых гараджан, бацькі, сваякі, сябры якіх жывуць у аддаленых вёсках і ім нязручна дабірацца ў паштовыя аддзяленні.



Знайдзіце магчымасць аформіць ім падпіску па месцы свайго жыхарства. Вы ахвяруеце невялікую суму (кошт месячнага камплекту нумароў менш за 8 рублёў), а ўдзячнасць будзеце мець на працягу доўгага часу.

Так, сіла "Народнай Волі" – у народзе. Разам будзем адстойваць ПРАЎДУ!

Рэдакцыя.

ЧУЛІ?

У Беларусі з 28 жніўня падаражэюць званкі па гарадскім тэлефоне і паштовыя адпраўленні

Як растлумачылі ў «Белтэлекаме», цяпер тарыфы не забяспечваюць поўнага пакрыцця затрат на аказанне гарадскіх тэлефонных паслуг. З 28 жніўня рэгулюемыя тарыфы на паслугі тэлефоннай сувязі вырастуць у сярэднім на 8,4 працэнта.

Што тычыцца тарыфаў на паслугі паштовай сувязі, то перасылка паштовай карткі, пісьма або бандэролі масай да 20 г для фізічных асоб падаражэе з 0,48 да 0,54 рубля. За кожныя наступныя поўныя або няпоўныя 20 г масы пісьма або бандэролі трэба будзе даплачваць не чатыры капейкі, а пяць.

Для юрыдычных асоб і ІП перасылка паштовай карткі, пісьма і бандэролі да 20 г падаражэе на пяць капеек – да 0,45 рубля. За кожныя наступныя поўныя або няпоўныя 20 г масы пісьма або бандэролі давядзецца даплаціць 4,17 капейкі (цяпер – 3,33 капейкі).

(БЕЛТА.)

КРИМИНАЛ

Рисовал... документы

Сотрудники Пинского пограничного отряда в рамках проверки оперативных сведений о фактах подделки документов – в госорганы была представлена поддельная справка о подтверждении трудового стажа для начисления пенсии – задержали 62-летнего художника из Кобрина.

Выяснилось, что он занимался изготовлением и подделкой нелегального «товара» на протяжении долгого времени. При осмотре его жилища пограничники обнаружили белорусские, украинские и польские паспорта, свидетельства о заключении брака и о рождении, аттестаты о среднем образовании, военный билет, бланки трудовых книжек и диплом о высшем образовании с приложением.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

главе Администрации президента Республики Беларусь Кочановой Наталье Ивановне

...То же самое, что слесарю отрубить руки

Уважаемая Наталья Ивановна!

Не удивляйтесь, что я решил обратиться к Вам через газету «Народная Воля». Дело в том, что в начале года я писал в Администрацию президента, но Ваши подчиненные, похоже, тогда мое письмо Вам не показали, а отправили по инстанциям. И ничего я не добился. А потому в газете Вы сами увидите мое обращение и, надеюсь, примете действенные меры.

А теперь все по порядку. Мой вопрос – простой и, казалось бы, не стоит выеденного яйца, но для меня сейчас это буквально дело жизни и смерти.

В результате непонятного желания финансового дознавателя С.Дмитриева я оказался свидетелем по уголовному делу №17081100001 (Федынича–Комлика). 7 августа 2017 года в квартире, где проживаю, был проведен обыск с изъятием «для проверки» принадлежащей мне и моей жене всей оргтехники – трех компьютеров и мобильного телефона. Можете представить, что такое изъять у переводчика все его орудия производства и средства к существованию! То же самое, что слесарю отрубить руки. В результате этого «изъятия» я понес (и продолжаю нести) значительный материальный (не говоря уже о моральном) ущерб.

Логика указанного дознавателя выглядит тем более странной, что в период, рассматриваемый в деле (2011–2012 гг.), профсоюз РЭП был просто одним из моих клиентов (уже позднее я стал активистом и профгрупоргом этого профсоюза) наряду со многими предприятиями, учреждениями, министерствами и ведомствами (в том числе и ГХУ Управделами Президента РБ). Страшно представить: если против каждого из моих бывших клиентов будут возбуждаться уголовные дела (упаси Бог!) и я буду привлекаться в них свидетелем каждый раз с изъятием оргтехники – никакой пенсии не хватит покупать компьютеры!

Уголовное дело, связанное с Федыничем и Комликом, давно рассмотрено, приговор провозглашен и вступил в силу еще год назад, указанные руководители профсоюза отбывают предписанную им «домашнюю химию» (большинство обвинений в суде не подтвердились и были отметены).

В материалах дела имеется заключение экспертов Следственного комитета о том, что в моей оргтехнике никаких материалов, представляющих интерес для правоохранителей, не обнаружено. Из Верховного суда я получил ответ: «В рамках указанного уголовного дела названное имущество вещественными доказательствами не признавалось».

В связи с тем, что я являюсь действующим переводчиком, указанная оргтехника мне жизненно необходима для работы. К тому же в изъятых компьютерах находятся документы, которые я должен представить в налоговую инспекцию. Но вот уже **два года** (!) мое имущество незаконно удерживается сотрудниками Следственного комитета Республики Беларусь, что, как известно, является серьезным правонарушением.

Повторяю, Наталья Ивановна: в январе нынешнего года я обращался в Администрацию президента Республики Беларусь, на что получил (оперативно и своевременно) ответ за подписью начальника главного управления по работе с обращениями граждан и юридических лиц Шлыка: «Ваше электронное обращение направлено в Генеральную прокуратуру Республики Беларусь с поручением сообщить Вам о результатах рассмотрения». Генпрокуратура тоже очень оперативно … переслала мое обращение в прокуратуру города Минска, которая незамедлительно переслала его в Следственный комитет по городу Минску.

Замечу: моя переписка по поводу возврата оргтехники составляет уже приличный том. В основном все обращения переадресовывались в тот Следственный комитет, на который я жаловался.

Можете догадаться, какой ответ мне был дан 14 февраля его сотрудником В.Н.Белковским: «Нарушений при изъятии и определении места хранения имущества, изъятого у Вас, органом уголовного преследования не допущено. Имущество изъято в установленном законодательством порядке». Кто бы сомневался! Я ему про Фому, а он мне про Ерему! Изъято, запаковано, увезено в легковом автомобиле и, я уверен, хранится вот уже ровно **два года** в самом надежном, сухом, хорошо отапливаемом и вентилируемом помещении Следственного комитета – в точном соответствии с законодательством. Но я в каждом своем заявлении не спрашиваю об условиях хранения моей оргтехники – я требую вернуть ее мне!

Прокуратура переправляет мое обращение в суд и объясняет: «При постановлении приговора суд в совещательной комнате разрешает вопрос о том, как поступить с имуществом, на которое наложен арест, и вещественными доказательствами». Год прошел после эпохального заседания суда (точнее судьи М.А.Федоровой, которая всё решала единолично), но с моей оргтехникой, которая так и не сумела стать вещдоками, судья никак не поступила.

В нетленной миниатюре Михаила Жванецкого, блестяще исполненной театром Аркадия Райкина, это называлось «запустить дурочку» (помните?): писать, отвечать, загружать почту и тянуть резину… Они нам – про насосы, а мы им – про колеса.

И речь ведь не только обо мне! Из офиса профсоюза РЭП и из офиса нашего партнерского профсоюза БНП в Солигорске, а также у активистов этих профсоюзов изъято огромное (по меркам этих общественных объединений) количество оргтехники, **которая до сих пор не возвращена законным владельцам**.

Что остается делать? Готовить документы и идти в суд против Следственного комитета с требованием возврата оргтехники, взывая к солидарным международным организациям о поддержке, как это было в «деле профсоюзов»? Нам это надо? Особенно в преддверии предстоящих выборов.

Наталья Ивановна! Убедительно прошу Вас вмешаться и решить вопрос о возврате мне конфискованной оргтехники (мобильного телефона SAMSUNG DOOS IMEI 356509/06/391603/5, ноутбука «Acer» MS2231, ноутбука HP Elitebook 2540p, системного блока стационарного компьютера). Такую же просьбу я передаю и от других лиц и организаций, у которых также «по делу Федынича–Комлика» изъяли немалое количество оргтехники.

С уважением –

Леонид Михайлович ЩУКИН,
профессиональный переводчик, профгрупорг профсоюза РЭП.

АНОНС



В Беларуси Русская православная церковь прописалась как ни одна другая. И ее прихожане имеют право знать, что творится в церковных верхах, какие стандарты жизни избрало руководство РПЦ.

(Об этом читайте на 8-й стр.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 ЖНІЎНЯ 2019 г.

ПРОЕКТ

На территории ОАО «Мотовело» могут создать технопарк

В администрации Ленинского района презентовали детальный план развития центральной планировочной зоны Минска.

Разработчик проекта – УП «Минскградо», заказчик – Комитет архитектуры и градостроительства Мингор-исполкома.

Территорию ОАО «Мотовело» предлагается рассматривать как площадку для перспективного размещения технопарка республиканского уровня, включающего участки экспериментального наукоемкого производства, научно-исследовательские лаборатории, выставочный комплекс, промотель, гостиницу. Фактически сегодня на территории завода пригодно к использованию только одно здание, в котором, возможно, разместится технопарк. Остальные сооружения должны пойти под снос, сообщает агентство «Минск-новости».

Проектом предусматривается, что после реконструкции производственные площади сократятся до 69,9%, озеленение до 0,8%, улично-дорожная сеть, наоборот, расширится до 22,5%.

Экспозиция проекта по 26 августа располагается в цокольном этаже здания администрации Ленинского района (ул.Маяковского, 83). Ознакомиться с материалами можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00. Высказать свои мнения и пожелания горожане могут до 5 сентября.

ПАЛІТХКУХНЯ

Як ідзе праца над альтэрнатыўным варыянтам Канстытуцыі?

"Народная Воля" пацікавілася ў старшыні грамадскай канстытуцыйнай камісіі ***Мечыслава Грыба****, ці ўжо распрацаваны папярэдні праект новай Канстытуцыі Беларусі, які можна выносіць на абмеркаванне.*

– Якраз днямі адбылася сустрэча працоўнай групы, я таксама прысутнічаў на гэтым пасяджэнні, – кажа Мечыслаў Іванавіч. – Пакуль ідзе актыўная, але руцінная праца. Адзін напрамак курыруе былы суддзя Канстытуцыйнага суда Міхаіл Іванавіч Пастухоў, другі – дырэктар Усходнееўрапейскай школы палітычных даследаванняў Аляксандр Дабравольскі.

У цэлым усё рухаецца нармальна. Мы вырашылі ўзяць за аснову варыянт Канстытуцыі 1994 года, таму што яна з'яўляецца легітымнай і законнай, а ўсе астатнія праўкі, змены і дапаўненні – мы на іх стаўку не робім і не ўлічваем.

Але да выніковага сходу нашай камісіі пакуль далекавата. Калі рабочая групы скончыць сваю працу, праект Канстытуцыі будзе зацверджаны і абмеркаваны грамадзянскай канстытуцыйнай камісіяй, мы яго апублікуем у сродках масавай інфармацыі, каб з ім маглі азнаёміцца ўсе грамадзяне Рэспублікі Беларусь. Будзе нейкі перыяд для абмеркавання, прапаноў і заўваг. Мы не робім ніякага сакрэту са сваёй працы.

Затым ужо дапрацаваны праект новай Канстытуцыі Беларусі мы маем намер накіраваць у Адміністрацыю прэзідэнта, у Канстытуцыйны суд, а таксама ўсім тым, хто працуе над зменамі і дапаўненнямі ў Канстытуцыю, якія анансаваў прэзідэнт.

– Вы як старшыня грамадзянскай канстытуцыйнай камісіі спрабавалі наладзіць нейкае канструктыўнае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі Канстытуцыйнага суда, якія, як вядома са слоў Аляксандра Лукашэнкі, рыхтуюць свой праект Канстытуцыі? Можа, варта было б аб'яднаць намаганні?

– Мы запісаліся на прыём да старшыні Канстытуцыйнага суда Пятра Міклашэвіча якраз па гэтым пытанні. Папярэдне было сказана, што, верагодна, нас прымуць 4 верасня. Мяркуецца, што на сустрэчу з Міклашэвічам разам са мной пойдуць Міхаіл Пастухоў і Анатоль Лябедзька. Не выключана, што да нас далучыцца нехта яшчэ.

Мы хацелі б папрасіць у старшыні Канстытуцыйнага суда, каб нам далі магчымасць азнаёміцца з тымі матэрыяламі, якія ў іх ужо напрацаваны, і, безумоўна, хацелі б падключыцца да працы над абноўленым варыянтам Канстытуцыі. У прынцыпе, гэта было б нармальна.

Мне здаецца, улада павінна толькі вітаць, што грамадскія краіны хочуць узяць удзел у распрацоўцы Асноўнага закона краіны!

Мы гатовы аб'яднаць намаганні, і нам сапраўды ёсць што прапанаваць.

Але спачатку, канешне, паглядзім, якая будзе рэакцыя на нашу просьбу. Ну, і ў цэлым нам хацелася б ведаць фармат меркаваных зменняў. Можа, мы ідзём у адным накірунку, а можа, і ў розных. Таму і хацелася б, каб размова з Пятром Міклашэвічам атрымалася дзелавой і грунтоўнай.

Марына КОКТЫШ.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ



Пушкін як маркер «русского мира»

Няшмат гарадоў у Беларусі могуць пахваліцца 1000-гадовым узростам. Нават сталіца наша слаўная юбілей з трыма нулямі адзначыць толькі праз трыццаць восем гадоў. А вось старажытны Брэст грымне ў літаўры ўжо сёлета. Што ж, 1000 гадоў – можна і паганарыцца. Як можна паганарыцца і сваім незвычайным месцазнаходжаннем: Брэст – адзіны ў Беларусі горад, праз які працякае рака Бог (Буг – спольшчаны варыянт).

Звычайна, дажыўшы да паважных юбілеяў, гарады ўспамінаюць і ўшаноўваюць сваіх заснавальнікаў ці гістарычных дзеячаў, чые імёны навечна ўпісаны ў мясцовую гісторыю. Так Полацк уганараваў велічным помнікам князя Усяслава Чарадзея, Віцебск – князя Альгерда, Мінск збіраецца ўсталяваць помнік Глебу Мінскаму, Слонім – Льву Сапегу, Ліда ўжо зрыхтавалася да адкрыцця коннага помніка князю Гедыміну.

А вось улады Брэста вырашылі парушыць традыцыю і дэманстратыўна абвясцілі, што ў юбілейны дні ў цэнтры горада з'явіцца трохметровы помнік… Пушкіну. Як быццам Аляксандр Сяргеевіч у брэсцкай цытадэлі ссылку адбываў ці па дарозе ў Адэсу ў Белавежскай пушчы зубра ўпаляваў, замачыўшы сваю ўдачу ў брэсцкай карчме кухлем медавухі.

Не адбываў, не ўпаляваў, міма не праязджаў, а "Песню пра зубра" зусім другі паэт напісаў. Дык за што "бронзы мнагапуддзе" чарговым разам дасталося Пушкіну? Ну як жа, запярэчыце вы, Пушкін нам знаёмы са школы, ён велічыня сусветная, помнікі яму і ў Афрыцы стаяць. Сапраўды стаяць. Дык жа і ў Беларусі ён ушанаваны больш чым дастаткова – у адным толькі Мінску два помнікі ў наяўнасці, яго імем названы абласная бібліятэка, праспект і станцыя метро. Помнікі паэту ёсць у Віцебску, Наваполацку і Магілёве, а вуліц Пушкіна ў нашай краіне – каля сотні.

У тым жа Брэсце імя Пушкіна ўжо носяць універсітэт, гарадская і дзіцячая бібліятэкі, адна з цэнтральных вуліц і Рускі культурна-адукацыйны цэнтр. Ды і помнікі-бюсты паэту (цэлых тры) брэстаўчане ўжо маюць шчасце бачыць. То навошта чацвёрты? Каму патрэбна гэтая пушкінізацыя Брэста, што праводзіцца з падазронай настойлівасцю?

Старшыня Брэсцкага гарвыканкама **Аляксандр Рагачук** патлумачыў, што новы помнік Пушкіну – падарунак расійскага Міністэрства культуры. Маўляў, тры тоны бронзы не каштавалі гарадскому бюджэту ні рубля, дасталіся на дармаўшчыну. А падараванаму каню, як вядома, у рот не заглядаюць і зубоў не лічаць.

Але Пушкін – не конь, і прыглядзецца да яго больш пільна мы права маем. Помніце, як чатыры гады таму меў месца скандал з помнікам Пушкіну ў Магілёве? Таксама ж падарунак Расіі. Абурэнне магілёўцаў выклікаў тады ўрывак з верша "Клеветникам России", змешчаны на пастаменце. Верш той быў напісаны пасля задушэння паўстання 1830 года. У ім паэт надзіва сугучна з сучаснымі пуцінскімі прапагандыстамі даваў адлуп ліберальнай Еўропе і заклікаў да рашучых дзеянняў суайчыннікаў: *"Вы грозны на словах – попробуйте на деле! / Иль старый богатырь, покойный на постеле, / Не в силах завинтить свой измаильский штык? / Иль русского царя уже бессильно слово? / Иль нам с Европой спорить ново? / Иль русский от побед отвык?"*.

Тыя "Клеветники России" нібы пршчапілі рускай літаратуры нейкі імперскі вірус, які з падскокам гуляў па ўсіх маскоўскіх і пецярбургскіх выданнях. Майстры пяра ў сваёй ваяўнічасці не адставалі ад сувораўскіх казакаў: *"И мы о камни падших стен / Младенцев Праги избивали, / Когда в кровавый прах топтали / Красу Костюшкиных знамен..."* Нават цар быў вымушаны на адным з падобных тэкстаў накрэсліць рэзалюцыю: "Прошу вас побежденных не ненавидеть". Падумаць толькі – цар уціхамірваў паэта!

Пуцін імперскі шал сваіх прыхільнікаў уціхамірваць не збіраецца. Наадварот, у патрэбны момант ён яго ўмела распальвае. Запалкай гібрыднай вайны на Данбасе ці крэсівам пушкінскага слова ў Магілёве. Відавочна, што "дзяржаўнік" Пушкін сёння спатрэбіўся Крамлю як маркер "русского мира", таму і дасылаюцца ў Беларусь (і пэўна, дзе прымаюць) падарункі ў выглядзе помнікаў. Так мядзведзь, вылезшы вясной з бярлогі, ходзіць па лесе і трэшча аб дрэвы – пазначае тэрыторыю.

Пазначэнне тэрыторыі помнікамі адбывалася і ў Крыме – там ужо ў часы ўкраінскай незалежнасці паўстала бронзавая Кацярына II. Само сабой зразумела – як падарунак Масквы… У Беларусь пакуль адгружаюць Пушкіных – на радасць нашым недальнабачным чыноўнікам, ласым на дармаўшчыну.

Масавы выраб і рассылка помнікаў-падарункаў прыводзіць часам да кур'ёзаў. Калі летась у Брэст прывезлі чарговы падарункавы кантэйнер з Масквы, усе супрацоўнікі гарадской бібліятэкі збегліся паглядзець на незвычайнага Пушкіна – у надзетым на галаву шлеме. Аказалася, на ліцейным заводзе ў Расіі пераблыталі і адправілі ў Брэст замест Пушкіна бюст Гагарына. Праз касмічны гермашлем касманаўт тады не пачуў, якімі словамі "прылашчылі" яго брэсцкія пушкінаўцы...

Як выглядае, брэсцкі галава Аляксандр Рагачук таксама пачуваецца як у глухім шлеме – не бачыць і не чуе, як беларуская гісторыя выцясняецца з вуліц кіраванага ім горада, дзе няма ніводнага (!) помніка беларускім класікам. Няўжо чыноўнік не разумее, што на полі, дзе не пасеяна сваё, добра ўзрастае чужое? І яшчэ дасца ў знакі. Прыйдзе час, і ўсім нам давядзецца расплачвацца за шчодрыя маскоўскія падарункі...

ХТО ЁСЦЬ ХТО

З Магілёва – у Мінск



Аляксандр Лукашэнка 19 жніўня прызначыў Андрэя Кунцэвіча намеснікам кіраўніка сваёй Адміністрацыі. Кунцэвіч будзе курыраваць пытанні ідэалогіі, грамадскіх аб'яднанні і сродкі масавай інфармацыі, паведамляе прэс-служба Лукашэнкі.

«Часу на развагуванне няма. Таму што перадвыбарная кампанія – гэта і яяліквая ідэалагічная работа. А вам даведзецца займацца перш за ўсё комплексам ідэалагічнай працы, пачынаючы ад журналістыкі і заканчваючы, наўпрост скажу, лекцыямі ў ВНУ», – адзначыў Лукашэнка.

Паводле думкі Лукашэнкі, трэба сустракацца з моладдзю і расказваць пра палітыку, якую праводзіць дзяржава, «бо наша моладзь, у інтэрнэце якая сядзіць, не заўсёды прачытае аб гэтай палітыцы, а калі і прачытае, дык часцяком усё навыварат перавернута».

«Інтэрнэт – гэта таксама будзе сфера ў нейкай ступені вашай адказнасці. І не з пункту гледжання ўсё закрыць і забараніць. А выкласці пазіцыю ўлады, пазіцыю прэзідэнта», – сказаў Лукашэнка.

Кар'ера Андрэя Кунцэвіча

Андрэй Кунцэвіч нарадзіўся ў Магілёве. У 2002 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Журналістыка», у 2007 годзе – Акадэмію кіравання пры прэзідэнце (спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія»).

Працаваў загадчыкам аддзела лістоў рэдакцыі раённай газеты «Зара над Друццю» (Бялыніцы), пасля – рэдактарам гэтага выдання. З 2009-га па 2011 г. займаў пасаду намесніка старшыні Шклоўскага райвыканкама, з 2011-га па 2013 год – начальніка ўпраўлення ідэалагічнай працы Магілёўскага аблвыканкама. З 2013-га па 2016 год працаваў намеснікам старшыні Магілёўскага гарвыканкама, з 2016-га па 2017 год – начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама. Са студзеня 2017 года быў на пасадзе намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама, адказваў за пытанні ідэалогіі, культуры, а таксама за ўзаемадзеянне з сілавымі органамі.

«З майго пункту гледжання, ідэалагічная праца была актуальнай заўсёды. Час паказаў, што сёння гэта вельмі важна, гэта запатрабавана не толькі ўладай, але і людзьмі», – сказаў Кунцэвіч пасля прызначэння, піша БЕЛТА.

Лічыць беларускую мову нацыянальным багаццем

У 2015 годзе Андрэй Кунцэвіч даў інтэрв'ю Радыё Свабода, у якім выступаў супраць палітызацыі беларускай мовы. Некалькі цытат адтуль:

• «Беларуская мова не павінна быць прыкметай нейкай асобнай палітычнай сілы альбо структуры, хоць на сённяшні дзень падобная сітуацыя мае месца».

• «Беларуская мова – гэта нацыянальнае багацце. Гэта тое, чым павінен валодаць і ганарыцца кожны, хто жыве ў Беларусі»;

• «Я б не ставіў знак роўнасці між панятцямі "патрыёт" і "беларуская мова". Так, беларусы мусяць ведаць беларускую мову і ёй карыстацца. Але калі ў чалавека няма жадання гэтак рабіць, то ён ад гэтага не становіцца не патрыётам».

(Радыё Свабода.)

РЭГІЁН

Гомельская філія «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» 24 жніўня праводзіць апошні бацькоўскі сход перад пачаткам навучальнага года

Запрашаюцца зацікаўленыя бацькі, прадстаўнікі сферы адукацыі, эксперты і ўсе неабыякавыя на тэматычную сустрэчу.

На сходзе абмяркуюць эфектыўнасць розных рэкламных захадаў, у тым ліку прэзентуюць бігборды з першай у Беларусі сацыяльнай рэкламай беларускамоўнай адукацыі.

Удзельнікі сустрэчы даведаюцца, ці ёсць тыя, хто хоча навучацца па-беларуску, ці былі яны раней і адкуль ім з'явіцца ў Гомелі.

Госць сустрэчы – журналістка Алена Германовіч, маці дваіх дзяцей. На сходзе ўзнімуць пытанне, што значыць быць беларускамоўным у Беларусі, як выхоўваць дзяцей, калі няма спрыяльных умоў для навучання па-беларуску.

На бацькоўскі сход запрашаюцца бацькі разам з дзецьмі, будзе працаваць гульнявая праграма з аніматарамі.

Гомельская філія ТБМ з 2015 года актыўна і сістэмна займаецца тэмай беларускамоўнага навучання ва ўстановах Гомеля і правяла ўжо трэці сезон заняткаў «Мова дзяцей», на якіх дзеткі ад 3 да 12 гадоў знаёмяцца з беларускай мовай, гісторыяй і культурай ды вывучаюць цэлы свет па-беларуску.

В Жировичском монастыре нашли гранату

На днях в Жировичский монастырь пришлось вызывать саперов: строители нашли гранату. Оказалось, это снаряд времен Второй мировой войны, сообщила милиция региона.

Строители во время ремонта в братском корпусе монастыря нашли на чердаке немецкую ручную гранату времен Второй мировой войны.

«При обеспечении необходимых мер безопасности граната была извлечена саперами и позже уничтожена», – рассказали в милиции.

По данным МВД, каждый месяц саперы выезжают на разминирование находок времен Второй мировой войны. Причем локации совсем разные, иногда – в людных местах. На прошлой неделе, например, во время земляных работ в центре Слонима на набережной по улице Огинского нашли 45-миллиметровый снаряд. Саперы извлекли его и уничтожили.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Как и с кем мы торгуем?

По данным Таможенного комитета, за первое полугодие текущего года экспорт товаров из Беларуси составил 15,592 миллиарда долларов, а импорт – 18,479 миллиарда. Отсюда отрицательное сальдо в 2,887 миллиарда долларов. По товарам в Беларуси отрицательное сальдо, то есть пассивный баланс, дело традиционное. Как правило, если страна покупает за границей больше, чем продает, значит, она залазит в валютные долги. Но в белорусском случае нас спасает экспорт услуг. По ним в последние годы сальдо всегда положительное, и оно перекрывает отрицательное сальдо по товарам. И выручает здесь в основном ПВТ с его растущим экспортом компьютерных услуг. По данным официальной статистики, суммарный экспорт товаров и услуг за январь–июнь на 310 миллионов долларов превысил их импорт. Все же эти результаты хуже аналогичного периода 2018 года. Экспорт сократился на 4,1%, а импорт – на 1,3%. В текущем году каждым 100 долларам импорта товаров соответствовало лишь 85,3 доллара их экспорта.

Опять-таки традиционная прореха в торговле товарами у Беларуси с Россией. За полгода отрицательное сальдо набежало на 3,946 миллиарда долларов. Конечно, это в основном закупки нефти и газа, по которым Россия остается единственным поставщиком, что очень печально. Но не только с Россией мы торгуем в минус. С Китаем отрицательное сальдо на 1,233 миллиарда долларов. Китайского импорта в Беларуси не счесть. А наши поставки в Поднебесную калийных удобрений не могут компенсировать пассивный торговый баланс. Начавшиеся поставки белорусской молочной и мясной продукции – пока мелочевка, а Китаю вообще – что слону дробина. Отрицательное сальдо в торговле товарами у Беларуси с развитыми странами. Например, в минус на 239 миллиона долларов мы наторговали с Германией, на 322 миллиона -- с Италией, на 289 миллионов – с США. Солидный плюс у нас с Великобританией (1132 миллиона долларов) и с Нидерландами (245 миллиона). Однако это за счет поставок туда нефтепродуктов и то в порты приписки, из которых они расходятся в разные страны. Да и в Германию в основном идет вся сырая нефть, добытая в Беларуси на Речицких месторождениях.

Помнится, установка властей о диверсификации белорусского экспорта, чтобы уйти от тотальной зависимости от российского рынка: треть – в Россию, треть – в ЕС и треть – в страны так называемой дальней дуги. Правильная установка. Но на практике никак не выполняется. Правда, ситуация с Россией улучшилась, зато положительное сальдо в торговле с Евросоюзом скукожилось более чем вдвое – с 1,858 миллиарда до 0,869 миллиарда долларов. Сказалась «грязная» российская нефть. Чтобы улучшить отчетность, а заодно уйти от тотальной зависимости от России, Беларуси необходимо наладить поставки сырой нефти на свои НПЗ из разных регионов мира через порты Балтийских стран и Украины. Такая задача давно ставится президентом на фоне дорожающей российской нефти, и имеется опыт таких поставок. Но для решения проблемы надо, чтобы наши НПЗ были экономически в состоянии, особенно после завершения реконструкции, покупать сырье по мировым ценам с учетом более сложной логистики его поставок.

Рекордный объем внешнеторгового товарооборота Беларуси был отмечен в 2012 году – 102,87 миллиарда долларов. Он такой получился не без помощи памятной аферы с «разбавителями-растворителями», когда под их видом гналось на экспорт традиционные нефтепродукты без уплаты пошлин в российский бюджет. Если брать скользящий год, то есть оборот с июля 2018-го по июнь 2019 года, то он составил 82,4 миллиарда долларов. Как видим, нам до своих же лучших показателей еще прыгать и прыгать. Наихудший показатель по внешнему товарообороту товаров и услуг был в 2010 году, когда минусовое сальдо превысило 7 миллиардов долларов, что составило более 15% к ВВП. Как следствие, в следующем 2011 году в стране разразился сильнейший валютно-финансовый кризис с обвальной девальвацией рубля и всплеском инфляции.

Если оценивать взаимные товарообороты Беларуси со странами СНГ, то они выглядят более обнадеживающе: с Казахстаном мы имеем плюс 304 миллионов долларов, с Украиной – плюс 974 миллиона, с Литвой – плюс 329 миллиона долларов. Положительный торговый баланс у нас в торговле и с Индией (250 миллионов долларов), и со многими, скажем так, не очень развитыми странами мира. Помнятся слова главы государства: продавайте хоть по чайной ложке, но продавайте. И послам Беларуси постоянно во главу угла ставится подобная задача. Все это правильно. Выйти на зарубежные рынки крайне трудно, они все заняты. Но все равно какие-то ниши есть. Когда белорусский президент посещает не очень развитые страны, он тоже пытается рекламировать в гостях нашу продукцию. Поскольку он любит оперировать круглыми числами в беседах с представителями этих государств, с его стороны обычно звучат два: если страна поприличнее, типа Ирана, то предложение довести взаимный товарооборот до 1 миллиарда долларов, если поменьше – до 500 миллионов долларов. Но на поверку товарообороты насчитывают пару-тройку сотен миллионов долларов, если не десятков.

Ясно, что для такой открытой экономики, как белорусская, которая большую часть ВВП поставляет за рубеж, решительное увеличение экспорта, диверсификация структуры и логистики экспорта – задачи жизненно необходимые. К примеру, лицо нашего экспорта формируют всего три товарные позиции – нефть и нефтепродукты (до трети всех поставок), калийные удобрения (до 10%) и мясомолочная продукция (до 7–8%). И решать их, на мой взгляд, нужно комплексно. Это касается и перевооружения наших предприятий более современными технологиями, для чего необходимы масштабные иностранные инвестиции, и более профессиональной работы маркетологов предприятий, да и послов тоже.

«Народная Воля»
в Facebook www.facebook.com/nv.online.info
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

ИЗ ЗАЛА СУДА

Столпотворение, слезы, знаки поддержки…

Вчера в Минском городском суде началось судебное разбирательство по очередному эпизоду громкого «дела медиков», которое расследует КГБ. На скамье подсудимых 21 (!) обвиняемый – чиновники системы здравоохранения и представители фармацевтического бизнеса. Из них семеро – за решеткой, их доставили в суд под конвоем. Остальным отвели первые три скамьи судебного зала.

Семеро – это экс-руководители РУП «Белфармация» и Центра экспертиз и испытаний в здравоохранении Минздрава **Вячеслав Гнитий** и **Александр Столяров**, их бывшие подчиненные (все обвиняются в получении взяток) и только один представитель бизнеса – директор компании «Искамед» **Сергей Шакутин**. Остальные бизнесмены, которых легко было узнать в общей толпе еще до начала суда по холеному виду и дорогой одежде (а на судебное заседание пришло более 100 человек), в суд прибыли самостоятельно. Все они также задерживались в прошлом году сотрудниками КГБ, но, проведя в СИЗО кто несколько дней, кто пару месяцев, были отпущены под домашний арест или подписку о невыезде. Например, уже не раз дававший показания в суде по «делу медиков» учредитель и директор компании «Геол-М» **Владимир Ладутько,** или известный витебский бизнесмен, председатель совета директоров крупнейшей частной аптечной сети, холдинга «Аптека групп» **Леонид Томчин,** а также исполнительный директор холдинга **Роман Альтшулер**, или председатель правления компании «Liberton» **Виталий Мусихин**. Есть среди обвиняемых и женщины. Бизнесменов обвиняют в даче взяток, максимальное наказание по предъявленной статье – лишение свободы на срок до пяти лет или до семи лет (за повторную дачу взятку). Но есть среди санкций и ограничение свободы.

Сергей Шакутин, к слову, воспользовался своим конституционным правом не давать показания против себя и не сотрудничал со следствием. Возможно, это одна из причин, почему бизнесмен находился в СИЗО КГБ с момента задержания – с 28 июня 2018 года. За эти год и два месяца, заявила в суде его адвокат, у Сергея Шакутина сильно пошатнулось здоровье: обострились хронические заболевания, появились проблемы с артериальным давлением, ухудшилось зрение, мучает бессонница, из-за которой бизнесмен испытывает постоянные головные боли. Защита Шакутина ходатайствовала перед судом об изменении в отношении обвиняемого меры пресечения. Среди аргументов не только состояние здоровья бизнесмена, но и то, что ухудшилось финансовое положение на его предприятиях, которые реализуют много социальных проектов. 546 сотрудников «Искамед» обратились с письмом к суду с просьбой освободить Шакутина из-под стражи. *«Он готов выступать в суде и принять участие в судебном разбирательстве»,* – заявила адвокат Шакутина.



Вячеслав Гнитий, бывший директор РУП «Белфармация».


Александр Шакутин пришел поддержать брата.

sputnik.by


На переднем плане – экс-руководитель Центра экспертиз и испытаний в здравоохранении Александр Столяров.

«Народная Воля»


Слева направо: Владимир Ладутько, Роман Альтшулер, Леонид Томчин.

К слову, около половины желающих, которые хотели попасть вчера на этот судебный процесс, – сотрудники аптечной сети «Искамед». *«Приехали из Гомеля, Могилева, Светлогорска, других городов*, – рассказывала «Народной Воле» перед судом кассир одной из минских аптек «Искамед» **Жанна Чмель**. – *Это лучший руководитель. которого только можно пожелать!»*

Поддержать брата пришел в суд и известный бизнесмен, председатель совета директоров «Амкодора» **Александр Шакутин**. Он не сдержал слез, увидев брата, и сразу же поддержал его жестами: сначала сложил руки в кулачки и потряс ими, а потом приложил правую руку к сердцу. Когда в суде объявили перерыв на 10 минут, Александр Шакутин подошел ближе к железной клетке и сказал: *«Сережа, я с тобой! Ты честный человек, и я это знаю»*.

«Вы верите, что брат невиновен?» – спросила «Народная Воля» у Александра Шакутина. *«Я не могу судить – я не знаю материалы дела,* – заметил руководитель «Амкодора», голос у него несколько дрожал. – *Мне сложно что-то говорить: виновен, не виновен. Это компетенция суда, не моя. Единственное, что могу сказать, – что мой брат с детства всегда был честным, открытым и доброжелательным. Никогда никому зла не сделал в этой жизни»*.

Судья **Игорь Любовицкий** ходатайство защиты Сергея Шакутина не удовлетворил: бизнесмен остается под стражей на все время судебного разбирательства. Частично судья удовлетворил второе ходатайство защиты Шакутина – рассматривать дело в закрытом режиме, и теперь на некоторые слушания в зал не будут никого пускать.

Вчера же у Минского городского суда было столпотворение. А также были слезы, жесты поддержки… Экс-директор Центра экспертиз и испытаний здравоохранения **Александр Столяров**, найдя в зале своих близких, приложил палец к носу и как бы вздернул его. Видимо, хотел сказать дочери: «Выше нос!» Сидевший рядом с ним в клетке его бывший подчиненный заплакал, когда увидел в зале свою мать. Женщина тоже не скрывала слез, сказала, что за то время, что сын находится в СИЗО – с февраля этого года, ей разрешили только одно свидание, сына обвиняют в получении взяток на 250 долларов. Одна из присутствующих на заседании женщин говорила, что Столярова не узнать, так сильно он похудел и осунулся. *«И цвет лица какой-то нездоровый. Но чего хотеть: больше года человек в неволе, практически без свежего воздуха»*, – вздыхала она.

Александр Столяров был задержан одним из первых – 31 мая 2018 года. Ему предъявлено обвинение по всем трем частям ст.430 Уголовного кодекса (получение взятки в особо крупном размере, либо организованной группой, либо лицом, занимающим ответственное положение), максимальное наказание – до 15 лет лишения свободы. Его бывший заместитель **Сергей Зинченко** за решеткой с 25 июня 2018 года, еще один бывший сотрудник Центра экспертиз и испытаний в здравоохранении **Сергей Лещиловский** находится в СИЗО с февраля 2019 года, а до этого времени – с июня 2018 года – был под домашним арестом. Зинченко и Лещиловский проходят по чч.1 и 2 ст.430 УК, максимальное наказание – 10 лет лишения свободы.

Еще трое чиновников, которые проходят по данному делу, – представители «Белфармации». Бывший руководитель государственной аптечной сети Вячеслав Гнитий был задержан 10 июля 2018 года, ему предъявлено обвинение по чч.2, 3 ст.430 УК, по которой предусмотрено наказание от 5 до 15 лет лишения свободы. Его бывшие подчиненные – **Екатерина Шнитко**, экс-заместитель гендиректора витебской «Фармации», и **Андрей Щука**, экс-генеральный директор гродненского филиала, были задержаны в августе прошлого года. Андрея Щуку обвиняют по ч.1 ст. 430 (максимальное наказание до 5 лет лишения свободы, но также может быть и ограничение свободы на этот срок). Екатерину Шнитко обвиняют в получении взяток либо в особо крупном размере, либо организованной группой, либо лицом, занимающим ответственное положение, и соответственно наказание предусмотрено более суровое – лишение свободы на срок от 5 до 15 лет. К слову, Еатерина Шнитко – единственная из всех обвиняемых, которые сидели в клетке, пыталась демонстрировать силу духа, показывая всем своим видом, что она не сломлена. Остальные обвиняемые сидели, опустив головы, и редко смотрели в зал, разве только когда хотели увидеть глаза своих близких…

К слову, подробности выдвинутых обвинений экс-чиновникам и бизнесменам станут известны позже. Вчера в суде большая часть времени ушла на так называемые организационные моменты. Например, больше часа суд устанавливал личности обвиняемых и их явку. Только после 15.00 гособвинители начали зачитывать обвинения фигурантам дела. Первое – Александру Столярову. В материалах его дела фигурируют несколько фактов получения взятки от 50 и до 5 тысяч долларов, всего, по подсчетам следствия, Столяров в промежутке с 2016-го по 2018 год получил взяток на сумму 50.600 долларов. *«Исключительно из-за занимаемой должности»*, – отметил прокурор. Столяров свою вину признал частично.

Мария ЭЙСМОНТ.

БЛІЦ

Ураду Сяргея Румаса – 1 год

Ці палепшылася за гэты час эканамічная сітуацыя ў Беларусі?

Вадзім ЮСУБ, старшы аналітык кампаніі "Альпары Еўразія":

– Пэўныя паляпшэнні ёсць. У прыватнасці, хоць і запавольваецца, але працягваецца рост эканомікі, растуць сярэднія зарплаты, растуць рэальныя наяўныя даходы насельніцтва, то бок рост даходаў апярэджвае інфляцыю. Але не трэба забываць, што гэта аднаўленчы рост эканомікі пасля падзення ў 2016–2017 гадах. Па-другое, зніжэнне інфляцыі, напрыклад, гэта заслуга не столькі ўрада, колькі Нацбанка.

Трывожыць тое, што не адбываюцца неабходныя сур'ёзныя структурныя рэформы эканомікі. Але гэта хутчэй не віна ўрада, а адсутнасць палітычнага рашэння на самым вышэйшым узроўні.

Уладзімір ДУНАЕЎ, прафесар філасофіі, член Грамадскага Балонскага камітэта:

– Ёсць статыстыка, што за студзень–чэрвень на 7 працэнтаў выраслі рэальныя даходы насельніцтва. Можа, яно і так. Праўда, я гэтых пазітыўных змен не заўважыў. Але, магчыма, гэта нябачныя дасягненні нашай эканомікі і новага ўрада.

Сяргей ЧАЛЫ, эканаміст:

– Думаю, эканамічная сітуацыя засталася на ранейшым узроўні.

Зараз адбываецца такая сітуацыя: ідуць роўнанакіраваныя працэсы, эканоміка дзесьці развіваецца, дзесьці гніе. Рост ВУП на 1–1,3 працэнта адбываецца ў асноўным за кошт росту спажывецкага попыту, а рэальны сектар – прамысловыя прадпрыемствы адчуваюць сябе не вельмі добра. Экспарт тавараў падае, экспарт паслуг расце. Стрымлівае рост эканомікі тое, што нічога не робіцца з неэфектыўнымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Але гэта не віна ўрада Румаса, іх паставілі ў такія ўмовы.

На мой погляд, нават персанальны склад цяперашняга ўрада быў абраны, зыходзячы з тактычных задач, а не стратэгічных. Напрыклад, міністрам фінансаў стаў Максім Ермаловіч, які быў намеснікам і адказваў за беспраблемную аплату знешніх запазык, гэтым ён цяпер і займаецца. Сяргей Румас у Банку развіцця займаўся выпраўленнем "касякоў" мадэрнізацыі ў дрэваапрацоўцы, абвешчанай у 2012 годзе, гэтым ён і працягвае займацца цяпер, толькі ў адносінах да ўсёй эканомікі. Адчуванне, што перад урадам стаіць задача працаваць так, каб нічога страшнага ў эканоміцы не здарылася да бліжэйшых выбараў.

Генадзь ДАВЫДЗЬКА, старшыня РГА «Белая Русь», намеснік старшыні пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:

– Асаблівых прарываў я не бачу. Але, гледзячы на стабільнасць нашай валюты, гледзячы на тое, што магчымасць купляць за зарплату застаецца ранейшай, думаецца, што эканамічная сітуацыя не пагоршылася – усё станоўча. Такая стабільнасць мяне задавальняе.

Анатолій ТРУХАНОВІЧ, бізнесмен:

– Бізнес-супольнасць вельмі станоўча ўспрыняла прызначэнне Румаса на пасаду прэм'ер-міністра. Ён дасведчаны эканаміст, фінансіст, чалавек шырокіх, перспектыўных поглядаў, ён бачыць і разумее праблемы нашай эканомікі. Але, напэўна, год – гэта не той тэрмін, па якім можна меркаваць аб тым, палепшылася ці не эканамічная сітуацыя ў краіне. Зрухі нейкія ёсць, хаця чакалася большага, думалася, што новы ўрад будзе больш рашучы хаця б у частцы выканання рэкамендацый МВФ. Напрыклад, не апраўдаліся мае чаканні адносна прыватызацыі.

У мяне ёсць свінакомплекс ААТ "Ананічы", у ім доля дзяржавы 12 працэнтаў. Прапаную прадаць: так было б зручней працаваць, смялей браць крэдыты. Не хочуць.

Альбо чаму ў Беларусі не аддаюць зямлю ў прыватныя рукі? Вазьміце сельскую гаспадарку ў Польшчы і ў нас. Чаму яна больш эфектыўная ў суседзяў? Таму што там няма начальнікаў-чыноўнікаў, там нават амаль няма бухгалтараў. У сельскай гаспадарцы Беластоцкага ваяводства зарэгістраваны ўсяго два бухгалтары, а ў Брэсцкай вобласці, паводле маіх падлікаў, у сельскай гаспадарцы працуе каля дзвюх тысяч бухгалтараў. У Польшчы яны не патрэбны, таму што прыватнік сам усё падлічыць, яму, як нашым калгасам, не трэба здаваць дзяржаве фінансавыя балансы, гадавую справаздачнасць Таму ў Польшчы і прадукты таннейшыя, і валавы прадукт на аднаго чалавека вышэйшы за наш у чатыры разы! У Беларусі 5 тысяч долараў на чалавека, у Польшчы – каля 20 тысяч.

Таму чакаць вялікага прарыву ў рабоце ўрада ў нашых рэаліях, напэўна, няправільна.

Ірына ТАЧЫЦКАЯ, акадэмічны дырэктар даследчага цэнтра ІПМ, кандыдат эканамічных навук:

– Я не ацэньвала б працу ўрада ў кантэксце змен сітуацыі ў эканоміцы, таму што на гэтую сітуацыю ўплывала шмат знешніх фактараў, якія не звязаны з працай урада, – у прыватнасці, перамовы з Расіяй па нафце і па іншых пытаннях.

Наўрад ці ад любога ўрада за год можна чакаць змен у эканоміцы, якія дазволілі б жыць лепш. Гэта той падмурак, які закладваецца карпатлівай работай. І хутчэй мы можам казаць пра тое, ці робіць урад нейкія крокі, каб змяніць сітуацыю. Я лічу, што такія крокі рабіліся. Напрыклад, цвёрдае рашэнне, што дзяржсектар не будзе атрымліваць падтрымкі, аб'яднанае рашэнне з Нацбанкам, што не трэба друкаваць грошы, для таго каб падтрымаць ВУП.

Алег ГАЕЎСКІ, пенсіянер:

– Мая эканоміка якая: як пражыць на пенсію! Нядаўна яе павялічылі на 6 працэнтаў, але ж і кошты растуць. Я нават не паспяваю сачыць за імі. Паўбохана нарэзанага смачнага, а не "сацыяльнага", хлеба каштуе больш за рубель! Каб не здаваў кватэру, не ведаю, як бы выжываў.

Апытвала Марыя ЭЙСМАНТ.

ИНИЦИАТИВА

«Робім разам»

За велосипедный Брест

Брест – город на западном рубеже Беларуси, в котором чувствуется европейский дух. Пешеходная улица Советская с частными магазинчиками, целые кварталы межвоенной двух- и трехэтажной застройки, много зелени.

– *До «настоящей» Европы нам пока далеко*, – утверждает глава городской организации «Говори правду» Александр Пась. – *В частности, городу не хватает инфраструктуры для велосипедного движения. Мало того, что границу на велосипеде пересечь невозможно, так и в самом городе дорожек недостаточно. Брестская команда «Говори правду» хочет изменить ситуацию. Поэтому и стартовал наш проект «Робім разам – создание велосипедной инфраструктуры». И начнем мы с микрорайона «Речица».*



Александр Пась рассказывает, что команда «Говори правду» установила контакты с инициативой «За велоБрест». При ее содействии городскими властями была разработана концепция развития велосипедного движения в городе до 2030 года.

– *Однако в ней мало конкретики, она какая-то «непонятная». Наша же цель простая и ясная – создание велосипедных дорожек от Брестской крепости вдоль улиц микрорайона «Речица». В частности, это улицы Речицкая, Солнечная, Дворникова, Писателя Смирнова. Дорожки могут быть обустроены как на тротуаре, так и вдоль проезжей части. Тем более что на многих улицах микрорайона нет интенсивного движения,* – говорит Пась.

По словам членов команды «Говори правду», в микрорайоне «Речица» большое количество домов частного сектора, у многих жителей которого имеются велосипеды. Также здесь проживает и много семей с детьми, которые в теплую погоду любят выбираться на велосипедные прогулки. Так что инициатива наверняка получит одобрение и поддержку жителей «Речицы». Тем более что при подготовке обращения к городским властям команда «Робім разам» обязательно выяснит, где, по мнению людей, велодорожки должны быть обустроены в первую очередь.

– *Вы, наверное, знаете, что команда «Говори правду» в прошлом году добилась асфальтирования 2-й Белорусской улицы и 2-го Западного переулка. А обустройство велодорожек – это еще и общее улучшение инфраструктуры микрорайона. Он становится более удобным и привлекательным для жизни,* – подытоживает Александр Пась.

Если же связать велодорожкой «Речицу», центр города и Брестскую крепость, то получится отличный маршрут для велотуризма. А это – прямое влияние на экономику города. Тем более что с недавних пор город входит в безвизовую зону.

Андрей ИГНАТОВИЧ.

Присоединиться к инициативе «Робім разам» в Бресте вы можете по телефону +375-33-605-77-54.

ПАДЗЯКА

Таленавіта і злабадзённа!

Паважаная рэдакцыя "Народнай Волі"! Вялікі дзякуй вам і асабіста аўтару калонкі Алеся Няўвесю!

Ён імгненна, ёмка, трапна, з уласцівым яму гумарам рэагуе на злабадзённыя з'явы нашай паўсядзённай рэчаіснасці.

Яго байкі і вершы, якія друкуюцца амаль у кожным нумары "Народнай Волі", чытаю з вялікім задавальненнем.

Яго сучасную творчасць можна смела параўноўваць з таленавітымі класікамі такога жанру.

Жадаю яму і надалей радаваць чытачоў сваёй творчасцю і каб яго талент яшчэ доўга заставаўся "не ўвесь" – быў невычарпальны!

З павагай, пастаянны чытач "Народнай Волі" –

Андрэй КАЗЕКА.

г.Баранавічы.

ПРАШУ ДАПАМАГЧЫ!

Хто памятае абеліск, што стаяў ля вуліцы Каліноўскага?

У 1972 годзе на прымыканні вуліцы Каліноўскага да праспекта Незалежнасці (тады Леніна) у Мінску стаяў абеліск з чырвонага граніту, на якім быў надпіс: *"Тут будзе ўстаноўлены помнік Кастусю Каліноўскаму".*

Я яго бачыў і, як і іншыя беларусы, быў рады, што калі-небудзь ушануюць памяць нашага патрыёта. Дасведчаныя людзі кажуць, што ў Пятра Машэрава былі сабраны ўсе паперы на ўстаноўку помніка Кастусю Каліноўскаму. Але ён не паспеў, загінуў. І здарылася неверагоднае: знік нават памятны камень з імем Каліноўскага!

Я звяртаўся ў Мінскі гарвыканкам, адміністрацыю Першамайскага раёна Мінска, Нацыянальны архіў, архіў кінафотадакументаў у г.Дзяржынску, Інстытут гісторыі Акадэміі навук Расіі. Адказ адусюль аднолькавы: інфармацыя пра ўстаноўку памятнага знака, пра тое, што ён быў на балансе, ці пра знос у іх адсутнічае.

Мяркую, што жывы яшчэ людзі, якія рабілі гэты абеліск, устанаўлівалі яго, фатаграфаваліся ля яго, а таксама якія на загадзе яго выкопвалі і дзесьці дзелі. Мо дзе ляжыць, як ляжаў пад сцяной суворaўскага музея з 1951-га па 1988 год адзіны на той час помнік Андрэю Тадэвушу Касцюшку, зроблены ў 1930 годзе Альбінай Відацкай і паўторна ўстаноўлены ў Сяхновічах каля Жабінкі да прыезду польскай дэлегацыі.

Праз рэдакцыю "Народнай Волі" звяртаюся да людзей, якія штосьці ведаюць пра гэты абеліск. Можа, у каго захаваліся яго фотаздымкі. Паведаміце, прышліце.

Гэта садзейнічала б установуцы помніка Кастусю Каліноўскаму ў наш час.

Беларусь як краіна была, ёсць і будзе заўсёды.

Беларусь як дзяржава без сваіх патрыётаў незалежнай не будзе ніколі.

З павагай –

Уладзімір Іванавіч ВАЛЕТКА.

Мінск.

ЗАКУЛІССЕ

Валерый Малашка не стаў «сваім» у Мінску

Рэдка бывае, каб чыноўнік з рэгіёна, апынуўшыся ў Мінску, не імкнуўся застацца ў сталіцы назаўжды. Валерый Малашка, якога ў 2016 годзе Аляксандр Лукашэнка перакінуў з Магілёўскага аблвыканкама на пасаду міністра працы і сацыяльнай абароны, а ў студзені 2017-га прызначыў міністрам аховы здароўя, не напружваўся, як кажуць, рукамі і нагамі зачапіцца як за высокія крэслы, так і за сам Мінск. Кажуць, што амаль за тры гады ён не займеў у сталіцы нават кватэры. Затое з усімі падначаленымі падтрымліваў нармальныя адносіны, арыентаваўся на цывілізаваныя метады кіравання, не быў заўважаны ў карупцыі.



Магчыма, Валерый Малашка не стаў у Мінску "сваім" з-за свайго спакойнага характару. Учора Аляксандр Лукашэнка даў згоду на прызначэнне яго намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. Фактычна ў абласны цэнтр ён вяртаецца на тую ж пасаду, якую некалі пакінуў не па сваёй ініцыятыве.

Нарадзіўся Валерый Малашка ў 1966 годзе ў Гродне. У 1989 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны медінстытут у Мінску, праз 18 гадоў – Акадэмію кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Антон КОРЗУН.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Згадзіцца швабра ці мятла, каб толькі таннаю была

У адной з мінскіх крам узнік ажыятаж (ажно на вуліцы стаяла чарга), калі прадавалі звычайныя швабры. Праўда, коштам усяго 3 рублі. Каб хапіла ўсім, выдавалі толькі па адной швабры на рукі.

Я, бадай, людзей магу
Зразумець па-чалавечы,
Як становяцца ў чаргу
За карысным, важным нечым,
Без чаго нягеглы быт
Ці духоўнай ежы мала.
Ды чарга, як маналіт,
І за швабрамі стаяла!
Быў такі ажыятаж
(Для мяне ён дзіўны самы),
Што чарга за дзверы аж
Пугай выслалася з крамы.
Ці ж у гэтай рэчы ёсць
Адмысловая пазнака?
Прымітыўная, як косць,
Што даўно абгрыз сабака.
І любы вясковы дзед
(Я пра гэта знаю змалку)
Швабру вырабіць як след,
Да кійка прыбіўшы палку.
Дык чаму ж пакупнікі
Марнавалі процьму часу –
Толькі б "палкі і кійкі"
Перанесці цераз касу?
І не купіш дзве ці тры,
Каб не мець затым дакукі:
Выдавалі гандляры,
Так сказаць, адну на рукі.
А чаму такі расклад?
Каб усёй чарзе хапіла!
(Колісь, трыццаць год назад,
Прадавалі гэтак піва.)
Хтось купіць хацеў бы пяць,
Быццам ён загваз у брудзе…
Сам ніяк не мог дапяць,
З-за чаго шалеюць людзі
І чарга, як вуж.
Таму
Запытаўся ўчора ў сябра:
– Я на розум не вазьму:
Ці ж набытак важкі – швабра?
Годзе мець яе адну,
І не будзе ў доме гадка…
– Ты, напэўна, на цану
Не звярнуў увагі, братка.
Швабры там – па тры рублі,
А раней былі па дзевяць.
Зараз час прыйшоў, калі
Людзі нашы множаць-дзеляць,
Эканомячы штодня
На любой паслузе, рэчы.
Мы ж у Еўропе не раўня –
Не жывём па-чалавечы.
Мы купляем нават хлам
Ці чужы абносак нейкі,
Калі крама гэта нам
Прапануе за капейкі…

«Зорачка» на пагон

На службу маёр,
Як службовец любы,
Пакрочыў уранні.
І так атрымалася,
Што галубы
Павыселі ў званні…

Цэны

– Схадзіў у аптэку…
Аднак жа, дальбог,
Там цэны такія,
Што лепей бы здох!
Хай Бог забірае
І цела, і дух…
– На цэны зірні
Рытуальных паслуг…


Ліхач

Ехаў хутка, фарсіста,
І спявала нутро!
Ды спыніў асабіста
Сам апостал Пятро…

СВОЯ КОЛЕЯ

Тише едешь, дальше будешь,

или Как развести настоящее улиточное стадо



Шесть лет назад городской житель Владимир РАБКОВ заложил первую в Беларуси ферму виноградных улиток. И сначала новое дело не пошло… Эти, казалось бы, неприхотливые брюхоногие, которых летом десятки под каждым лопухом, в домашних условиях требовали совершенно точных знаний и огромного усердия. Вроде бы примитивные моллюски, а попробуй разведи стадо да перейди на следующую после простого любительства ступень – преврати красивую идею в доходный бизнес.

В общем, Владимир оставил город, офис, галстуки с костюмами, переехал на постоянное жительство в сельскую местность и погрузился в технологический процесс «под самый панцирь», чтобы приспособить природный цикл жизни улитки к производственному, а значит, прибыльному. Но прежде всего, как признается, изменился сам. Только так дело и делается. Теперь его «Ратов» – довольно известное предприятие, свою продукцию оно поставляет в лучшие рестораны Минска, да и индивидуальный покупатель с удовольствием заказывает у него моллюсков через интернет. Здоровое питание, сэр!



– На первый взгляд улитки – довольно дешевое производство, разве нет? Собственно, для улиточного стада что нужно: вода, трава и земля. Какие еще вложения?

– А температура? В дикой природе немалая часть улиток погибает за зиму, потому что не смогли хорошо зарыться в землю. На ферме мы на зиму собираем улиток в отдельное помещение с правильной температурой. Часть, укрывая, оставляем в земле. Таких улиток – Helix pomatia – в мире почти никто не выращивает, это чисто наши брюхоногие. А у меня взрослое стадо, выращенное с икринки.

– А стадо – это сколько?

– До пяти тонн. Я сам могу контролировать объем своего стада, сейчас это приблизительно такая цифра.

– Но ваш бизнес сезонный, да? Насколько я знаю, улиток собирают только в мае-июне.

– Это в дикой природе. А на ферме я работаю круглый год. Вот, например, утка дикая и утка фермерская – есть разница? Так и улитки. Вроде генетически материал одинаковый, но мои в теплый сезон кроме зелени едят отборные фрукты и овощи – те же самые, что и моя семья. Плюс я покупаю различные злаки и сам готовлю для них специальный комбикорм по своим рецептам. Тогда мясо улиток гораздо нежнее, более сочное. Добавляю в комбикорм мел. А кукуруза нужна ближе к зиме, чтобы жирка больше набрали, зимовку лучше перенесли. Эти нюансы познаются только в процессе наблюдения.

Смысл в том, что я улиток сделал домашними. Самые первые были к этому процессу не готовы. Но вот уже их малечки выросли на ферме, и жизнь их пошла по-другому. Свои три-четыре года они живут в изобилии и гармонии.

– Может быть, еще и под музыку будете их разводить?

– Угадали! Попозже обязательно сделаю.

– Насколько я знаю, вы по базовому образованию не биолог.

– Нет. Я инженер-механик. Но биологию в детстве очень любил, в школе получал одни пятерки. И предпринимательская жилка у меня была всегда. Первые навыки я получил, когда в 8-м классе самостоятельно выкармливал кроликов на даче. Мы жили тогда с родителями в Корме на Гомельщине. У меня был свой маленький доход, свои клиенты. Поэтому, когда отца перевели в Минск, я ехал в столицу с большой неохотой. Думал: чем там заниматься?

– А кто или что дало толчок, чтобы вы сейчас из офиса вернулись к живой природе?

– Все процессы идут эволюционно. Работая в офисе, я набрал лишний вес и стал задумываться о правильном питании, стал формировать свои вкусы. Решил поначалу выращивать моллюсков для себя. Потому что, когда человек правильно питается, у него меняется энергетический потенциал, приходит в норму кислотно-щелочная среда кишечника, и мысли тоже приходят в порядок.

– Думаю, белорусы вряд ли откажутся от сала с мясом в массовом порядке.

– И не надо отказываться. Это дополнение к привычному рациону. Если вы не занимаетесь тяжелым физическим трудом, то лучше, конечно, пообедать или поужинать более легкой пищей. Особенно тем, кто проводит свой рабочий день, сидя за столом.



– То есть наш менталитет ваш бизнес не остановит.

– Наши граждане – люди очень порядочные.

– Кто спорит, но улитки для большинства экзотическая еда.

– С каждым фестивалем еды ко мне подходит все больше гурманов. Первое время я чуть ли не каждого человека учил, как правильно есть улиток. Потом каждый десятый уже знал, потом каждый седьмой, сейчас каждый четвертый, чему я очень рад.

– Кстати, последователи (или конкуренты) у вас уже есть?

– Есть восемь филиалов, где люди работают по моей технологии, есть партнеры, с которыми я тесно сотрудничаю и помогаю выйти на рынок.

– А почему они самостоятельно не отдают продукцию на рынок?

– Хм, легко сказать!

– Но трудно сделать? А как вы нарабатывали связи с потребителем?

– На старте сотрудничал с консалтинговым белорусско-французским агентством «Франс групп». Они узнали о ферме из местной газеты, а поскольку улитки – французский традиционный деликатес, решили предложить мне свои услуги.

– Документы на бизнес районные власти выдавали без проволочек и проблем?


– Без проблем. Их никогда не было со стороны властей. А почему они, собственно, должны быть?

– Новое дело. Ни у кого нет опыта оформления такой продукции, как виноградные улитки.

– Опыт переняли у польских коллег. Да, сначала документы тормозились в кабинетах из-за нехватки знаний. Но этот период позади.

– Сколько человек сейчас обслуживают ферму?

– Я с женой и один помощник. Братья и сестры чисто по-волонтерски приезжают, когда идет сбор улиток. Это трудоемкий процесс. Отпуск? Нет, мы работаем круглый год. Улиток надо обслуживать и в анабиозе. Думаете, заснули и все?



– Неужели даже зимой их надо подкармливать?

– Нет, но есть свои технологические тонкости, которые я не афиширую. Лично я добывал их ценой ошибок. В добычу этих знаний я уже вложил шесть лет своей жизни и продолжаю вкладывать.

– Но все-таки почему не наймете работников в помощь? Или это в деревне проблема? Говорят, вымирает на селе трудовой люд, изводится как класс.

– Я бы не обобщал. Вообще в деревне народ более чуткий, более отзывчивый, чем в городе. Но есть люди, которые могут работать, а есть люди, которые не могут работать. Конечно, у каждого своя судьба, но многим просто ничего не надо, такая у них жизненная философия, они даже насос в свой колодец не хотят ставить: «Мне в день нужно два ведра воды». А деньги здесь есть у всех, могут позволить себе комфортные условия. Но если человек думает, что он беден, то он, конечно, беден навсегда. Хотя от голода никто не умирает, наоборот, все, как правило, переедают. А насчет рабочих мест – они будут у меня создаваться позже. Видите ли, вложения отбиваются не за неделю, месяц, два. У меня только на четвертый год началось возвращение тех средств, которые вкладывал.

– И свободного времени у вас пока тоже нет…

– Когда занимаешься любимым делом, это уже свобода. Сейчас труд и труд. Качество продукции у меня на первом месте, не количество. Можно, конечно, рвануть. Но главное – не потерять в качестве. Я в первую очередь стараюсь для людей.

– Но не в последнюю очередь вы должны зарабатывать. Иначе для чего весь бизнес?

– Когда на первом месте качество, заработок не отстает. Но должно пройти время, завоевать место на рынке непросто. Бывали моменты, когда опускались руки…

– А потом что изменилось?

– Я изменился. Стал опытнее, не побоялся рисков. Вообще, самое страшное – начать в жизни делать что-то новое. Особенно бросить нелюбимую работу.

– Что же вам помогло?

– Жизненная ситуация, моя вторая половинка. Виктория поддерживала меня, когда мне было трудно психологически. Сейчас этих проблем нет, но были, были: я торопился забежать вперед в будущее. А этого делать не надо. И еще очень важно не сомневаться. Когда сомневаешься, сам оттягиваешь приближение результата.

– А жена – она как хороший резонатор, да?

– Она уравновешивает мои страсти. Притормаживает, когда я слишком тороплюсь вперед. Вика и бухгалтер, и секретарь одновременно, еще и по дому успевает хозяйничать.

– Ваш райцентр Кореличи часто просит приехать с улитками на праздник?

– Просят, мы приезжаем на фестивали с уже готовой продукцией. Но в райцентре деликатес покупают пока… с осторожностью.

– Кстати, вы не пробовали отдавать улиточную слизь – муцин – отечественным косметологам?

– Мы получили слизь наших улиток на дорогостоящем оборудовании в Италии. Она высококачественная. Вот и все. Дальше говорить не хочу.

– Инертность мышления местной промышленности?

– У наших косметологических фирм нет технологий для работы с натуральным сырьем. И знаний, наверное. Ведь способы добычи слизи очень разные. А еще ведь есть фармацевтика: сироп от кашля на муцине, заживляющее средство на муцине при жестких травмах. Это испытано уже корейцами. В общем, нам есть куда развивать наш бизнес. Хочется создавать что-то новое. Какой смысл повторять? Мы для школьников часто проводим экскурсии по нашей ферме. Я всегда ребятам говорю: если после школы кто-то захочет заняться улиточным бизнесом – приходите, обучу технологическому процессу. Пройдете у меня практику – всему научитесь!

Елена МОЛОЧКО.

Кореличский район.

ЧУЖОЙ ОПЫТ

Закрыть АЭС – просто ли это?

В Германии снесли «надрезанную» охладительную башню атомной электростанции. Зрелище длилось всего пару секунд. 80-метровая бетонная градирня (охладительная башня) атомной электростанции в городке Мюльхайм-Керлих на берегу Рейна к северу от Кобленца элегантно сложилась за считанные мгновенья. Скоротечность этой с инженерной точки зрения отлично подготовленной технической операции порождала банальную мысль, что сносить – не строить.

Однако опыт Германии показывает, что такое понимание в корне неверно, если речь идет об атомных электростанциях.



Охладительная башня АЭС в Мюльхайм-Керлихе в момент контролируемого обрушения.

Демонтаж продлится четверть века

Подобные радиационно опасные объекты (РОО) нельзя просто так снести. Их можно законсервировать или по особой технологии демонтировать, обеспечивая соблюдение строгих норм безопасности при разборке их радиоактивных составных частей. На это, а также на захоронение ядерных отходов, уходит обычно куда больше сил, средств и времени, чем на сооружение АЭС.

Так, демонтаж атомной электростанции в Мюльхайм-Керлихе начался в 2004 году и продлится еще предположительно целое десятилетие, иными словами, займет примерно четверть века. А строилась она чуть больше десяти лет – в 1975–1986 годах. По данным ее собственника, компании RWE при демонтаже предстоит вывести и надежно захоронить примерно 1700 тонн радиоактивных материалов. Общая же масса вывезенных грузов составит под конец примерно 500 тысяч тонн.

Так что окончательный снос градирни в Мюльхайм-Керлихе 9 августа был всего лишь мимолетным, хотя и эффектным, эпизодом в длинной череде трудоемких и весьма дорогостоящих процессов. Только на демонтаж одной этой охладительной башни, с радиацией никак не связанной, ушло больше года – и несколько лет подготовки.

Почему для демонтажа понадобился экскаватор-разрушитель

Дело в том, что RWE сразу же исключила снос градирни с помощью взрыва: это представлялось слишком рискованным из-за близости главного корпуса АЭС с выведенным из эксплуатации, но все еще остающимся там реактором, хотя и без ядерного топлива (его вывезли еще в 2002 году). К тому же в непосредственной близости проходят автодорога и железнодорожная магистраль.

Поэтому на верхушку на тот момент 162-метровой башни (выше Кёльнского собора) был поднят специально сконструированный для этой цели экскаватор-разрушитель с гидравлическими ножницами, который, двигаясь по кругу, постепенно «отгрызал» один кусок бетона за другим.

Однако на высоте 80 метров дальнейшее использование экскаватора стало невозможным из-за возрастающего наклона расширяющейся книзу башни. Но и тут от взрыва отказались. Вместо этого использовали два других экскаватора-разрушителя с дистанционным управлением: они выломали около 20 из 72 свай, на которых стояла градирня, и в назначенное время (информационный телеканал n-tv вел прямую трансляцию) предварительно специально «надрезанная» башня просела под собственным весом.

Когда в Германии атомные станции окончательно исчезнут с лица земли?

Во сколько обошелся снос градирни, не сообщается, но в целом за то, чтобы полностью сравнять с землей бывшую АЭС в Мюльхайм-Керлихе и освободить место для новой промзоны (один земельный участок уже куплен машиностроительной фирмой), компании RWE придется заплатить свыше 1 миллиарда евро. Но здесь был только один реактор.

А вот на то, чтобы сначала обезопасить, а потом демонтировать шесть энергоблоков выведенной из эксплуатации вскоре после объединения Германии АЭС в Любмине близ Грайфсвальда на территории бывшей ГДР, уже потрачено существенно более 3 миллиардов евро из государственной казны. Работы здесь ведутся с 1995 года и продлятся предположительно до 2028 года. А вторую, менее крупную, атомную электростанцию ГДР в Райнсберге планируется полностью снести к 2025 году.

АЭС в Лингене на западе ФРГ, выведенную из эксплуатации еще в 1977 году, планируется демонтировать лишь в 2035-м. А, скажем, блок Б атомной электростанции в баварском городке Гундреммингене, сооруженный в 1976–1984 годах и отключенный к концу 2017 года, окончательно исчезнет с лица земли не раньше 2040-го.

Немецкие СМИ напомнили об истинной цене ядерной энергетики

Впрочем, все эти сроки и расходы просто блекнут перед тем временем и теми деньгами, которые потребуются для длительного безопасного захоронения радиоактивных отходов. Тут речь идет о столетиях и десятках миллиардов.

Во всяком случае в 2017 году четыре оператора немецких АЭС частные компании Eon, RWE, EnBW и Vattenfall внесли 24 миллиарда евро в специальный государственный фонд, перед менеджерами которого поставлена задача к 2100 году увеличить этот капитал примерно до 169 миллиардов евро. Именно столько, согласно прогнозам, придется заплатить в общей сложности за временное хранение и окончательное захоронение тех радиоактивных отходов, которые накопятся в Германии к моменту отказа от ядерной энергетики к концу 2022 года.

Подобные расходы, которые во Франции или в России берет на себя государство, иными словами – полностью оплачивают налогоплательщики, обычно не учитывают при подсчете стоимости электроэнергии, вырабатываемой атомными электростанциями. Немецкие СМИ воспользовались зрелищным сносом охладительной башни на берегу Рейна, чтобы вновь напомнить своим зрителям, слушателям и читателям, сколько на самом деле стоит ядерная энергетика.

ПАРАЛЛЕЛИ

Шесть стран, где о пожилых людях заботятся лучше всего

Оказывается, поговорка «старость не радость» актуальна далеко не везде. Есть страны, где именно после выхода на пенсию у людей и начинается самая счастливая часть жизни. Еще бы: дети и внуки выросли, кредиты за дом и машину погашены, медстраховка выплачена, а на пенсионном счету накоплена солидная сумма… Так что можно жить в свое удовольствие, ни в чем себе не отказывая. Знакомьтесь: вот шесть стран, в которых живут самые счастливые пожилые люди.



Норвегия

Валовый доход на душу пожилого населения здесь в среднем 78.000 долларов в год. При этом государство покрывает 90% расходов на обследование и лечение, причем даже в стационаре. Кстати, средний размер пенсии составляет примерно 21.000 норвежских крон (около 4794 рублей) в месяц.

Интересно, что даже в самой глухой норвежской деревушке обязательно есть аптека с полнейшим ассортиментом лекарств (вот бы у нас так!).

А еще в отличие от наших стариков норвежские пенсионеры не боятся дома престарелых. Наоборот, многие одинокие люди сами идут туда, потому что знают: их ждет качественное питание, уход, общение и… ежегодный отдых на курортах Испании или Италии.

Швейцария

Чтобы понять, как живется старикам в Швейцарии, достаточно сказать, что средняя продолжительность жизни здесь около 90 лет. Поэтому уход на пенсию для швейцарцев означает не уход на покой, а переход к другим видам активной деятельности.

Большинство стариков (хотя какие они старики – еще столько лет впереди!) осваивают новые профессии, открывают свой бизнес, получают второе образование или уходят с головой в общественную и социальную деятельность. Короче, не ставят на себе крест (как наши бабушки и дедушки), а реализуют то, что не успели сделать в молодости.

Люксембург

Маленький Люксембург (пересечь эту страну на машине можно всего за несколько часов) – обладатель одной из самых совершенных систем здравоохранения в мире. Вот почему здесь просто замечательно живется пенсионерам (как, впрочем, и молодым). Об этом говорит и средняя продолжительность жизни – более 80 лет.

Благодаря близкому расположению страны к самым фешенебельным курортам Испании, Франции, Бельгии, здешние старики не отказывают себе в роскошном отдыхе. А солидная пенсия позволяет им не только посещать рестораны, кафе и различные светские мероприятия, но и быть в курсе всех новинок моды.

Между прочем, в Люксембурге понятия не имеют о том, что молодые должны помогать пожилым. А все потому, что накопленных средств и пенсии местным старикам вполне хватает на счастливую (если не сказать райскую) жизнь.

Швеция

Пенсионная система Швеции признана самой социальной в мире. Еще бы, ведь пенсии там составляют до 80% от зарплаты (для сравнения – в Беларуси этот показатель 55%). В среднем шведские пенсионеры получают 2000 долларов.

Кстати, тем старикам, которые получали небольшую зарплату, государство гарантирует минимальную пенсию – 1050 долларов для каждого из супругов и 1180 долларов для одиноких людей. Еще для пожилых людей предусмотрены дотации в размере 93% на оплату жилья и коммунальных услуг.

А еще в Швеции для людей преклонного возраста существуют сотни клубов, кружков по интересам и различных развивающих центров. Причем все это бесплатно или за какую-то символическую плату. Так что сидеть на лавочках, поплевывая семечки и сплетничая о соседях, шведским старикам просто некогда.

Австралия

Государство гарантированно платит пенсию любому гражданину Австралии, который достиг 65-летнего возраста. Причем независимо от стажа и уровня зарплаты. Удивительно, но здесь пенсию выплачивают даже тем людям, кто никогда не работал.

К пенсии также прилагается пакет различных льгот. Например, абсолютно бесплатное медобслуживание и покупка лекарств с большой скидкой. Госпенсия для одиноких австралийцев составляет примерно 1100 долларов в месяц, супружеские пары получают по 980 долларов на каждого. А ведь существуют еще и частные пенсионные вклады.

Кроме того, в Австралии действует государственная программа Aged Life Care по поддержке высокого уровня жизни пожилых людей. А сотрудники множества благотворительных фондов и общественных организаций следят, чтобы все права и интересы стариков неукоснительно соблюдались.

О внимании со стороны государства говорит и такой интересный факт: английская королева, которая номинально правит в Австралии, присылает каждому жителю страны, отметившему 100-летний юбилей, персональное поздравление.

Япония

Между прочим, в Стране восходящего солнца живет более 40.000 человек, чей возраст превышает 100 лет. Учитывая то, что на пенсию здесь выходят в 65 лет, японские старики могут еще много лет наслаждаться беззаботной жизнью.

Правда, средняя пенсия в Японии не так чтобы очень велика – около 67.000 йен (что-то около 1234 рублей). Но большинство здешних стариков это не очень смущает.

Дело в том, что японские старики – очень активные люди, которые умеют наслаждаться появившейся свободой. Выйдя на пенсию, они с удовольствием начинают учиться чему-то новому: одни идут в школу фотографии, другие осваивают приготовление блюд европейской кухни, третьи учат языки.

А еще здешние пожилые люди посещают бассейны и спортзалы, отправляются в походы, учатся новым ремеслам, ходят в рестораны, являются членами разных клубов и кружков, встречаются с друзьями, занимаются живописью, икебаной, каллиграфией и находят много других интересных занятий.

Ну как, вы и теперь считаете, что старость не радость?



З НАГОДЫ

Вялікі ідэал Івана Луцкевіча



100 гадоў таму адышоў у вечнасць адзін з айцоў беларускай дзяржаўнасці. 20 жніўня 2019 г. спаўняецца 100 гадоў са смерці Івана Луцкевіча, чалавека, якога смела можна назваць адным з айцоў беларускай дзяржаўнасці. Некаторыя з яго сучаснікаў называлі яго правадыром і першым у тройцы лідараў беларускага руху, у якую ўваходзілі таксама Антон Луцкевіч і Вацлаў Іваноўскі.

Менавіта імпэт, гарачы запал і ідэалізм І.Луцкевіча 116 гадоў таму рушылі наперад беларускі нацыянальны рух. Не выклікае спрэчак, што менавіта І.Луцкевіч прыклаў намаганні, каб беларускі рух, які толькі-толькі нараджаўся, набыў форму палітычнай партыі – Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, якая праз год стала называцца Беларускай Сацыялістычнай Грамадой (БСГ). Новая партыя, узначаленая маладымі людзьмі, у канцы 1903 г. на сваім першым з'ездзе сфармулявала мэту беларускага руху: наша краіна павінна стаць незалежнай дэмакратычнай рэспублікай. Паўсталым пазней правым беларускім партыям заставалася толькі ўзяць гэты лозунг на ўзбраенне.

Амаль 15 гадоў паняцці "беларускі рух" і "Беларуская Сацыялістычная Грамада" былі сінонімамі.

* * *

Іван Луцкевіч нарадзіўся 28 мая 1881 г. у павятовым горадзе Шаўлі Ковенскай губерні, дзе яго бацька служыў на чыгунцы. Калі хлопчыку споўнілася шэсць гадоў, сям'я пераехала ў Лібаву. Там у 1890 г. Іван пачаў хадзіць у Мікалаеўскую гімназію.

Змалку ён цікавіўся старасветчынай. Быў першы ў класе па веданні гісторыі. З трэцяга класа пачаў збіраць манеты і розныя старасвецкія рэчы.

У гімназіі вучыліся дзеці розных нацыянальнасцяў і сацыяльных груп. Дзеці расійскіх чыноўнікаў, нямецкіх баронаў і польскіх паноў з пагардай глядзелі на сыноў латышскіх і літоўскіх сялян ды мяшчан. Іван, выхаваны ў сям'і, якая жыла ўспамінамі пра паўстанне 1863 г. (у гэтым паўстанні загінуў яго дзядзька) і ідэаламі дэмакратызму, шукаў сяброўства не з панічамі, а з дзецьмі "простых" людзей.

Праз сваіх сяброў Іван сышоўся з літоўскім гуртком, які ўзначальваў лібаўскі тэлеграфіст Ёнас Амбразайціс. Слухаючы Амбразайціса, падлетак прыйшоў да думкі, што яго народ мае такое ж права на лепшы быт, як і іншыя народы. Чытанне гістарычнай літаратуры падказвала яму, што беларускі народ не заўсёды жыў так, як цяпер, меў слаўную мінуўшчыну і нямала культурных дасягненняў.

У 1895 г. сям'я Луцкевічаў перабралася ў Менск. Іван жа працягваў вучыцца ў Лібаве, аднак пасля смерці бацькі ў 1897 г. у Менск пераехаў і ён.

У Менску найбольшы ўплыў на Івана мелі два чалавекі: археолаг Генрык Татур, якога палякі называлі беларускім нацыяналістам, ды сын паўстанца, паэт і мастак Казімір Кастравіцкі, які ўвайшоў у гісторыю нашай літаратуры як Карусь Каганец. Пад іх уплывам развіваўся нацыянальны светапогляд Івана. У Менску склаўся і яго сацыяльны ідэал. У арганізаваным Іванам беларускім гуртку падлеткі вывучалі не толькі гісторыю свайго народа, але і тэорыю Карла Маркса.

Скончыўшы ў 1902 г. гімназію, Іван стаў студэнтам Пецярбургскага ўніверсітэта і вывучаў там права. Адначасна вучыўся ў Археалагічным інстытуце. У Пецярбургу Іван і яго брат Антон пазнаёміліся са студэнтам Тэхналагічнага інстытута Вацлавам Іваноўскім, які ўзначальваў групу моладзі з Віленскай губерні. Якраз у 1902 г. у Іваноўскага нарадзілася ідэя стварыць Беларускую Рэвалюцыйную Партыю. Аднак праграмны дакумент гэтай партыі больш падыходзіў для культурна-асветніцкай, а не палітычнай арганізацыі. І так склалася, што Іваноўскі ўзначаліў заснаваны ўвосень 1902 г. Беларускі круг народнай асветы і культуры, які ў наступным годзе распачаў беларускую выдавецкую справу XX ст., а Іван узяўся за стварэнне беларускай палітычнай арганізацыі.

Стварэнню партыі перашкодзіў арышт Івана перад днём 1 Мая 1903 года. Яго кінулі спачатку ў "предварилку", а потым у сумна вядомыя "Кресты". На волю ён выйшаў толькі ў верасні і адразу ж узяўся за справу. Вынікам яго працы стала заснаванне ў канцы 1903 г. Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады. На І з'ездзе партыі быў зацверджаны нарыс яе праграмы. У гэтым дакуменце ўтрымліваліся тыпова рэвалюцыйныя і сацыялістычныя пастулаты. Адметнасцю было тое, што ў ім, як ужо напісана вышэй, быў тэзіс аб незалежнай дэмакратычнай рэспубліцы ў Беларусі.

Ведучы палітычную дзейнасць, Іван не спыняў вучобу. У 1904 г. ён скончыў Археалагічны інстытут і атрымаў накіраванне ў Венскі ўніверсітэт – удасканальваць свае веды ў "Славянскім семінары" выдатнага харвацкага славіста Ватраслава Ягіча. Там ён напісаў для часопіса Ruthenische Revue артыкул "Мёртваю абвешчаная Беларусь", які ў перакладзе з нямецкай на англійскую і пад загалоўкам "Беларусы. Нацыя, адкінутая ў сярэднія вякі пад маскавіцкім панаваннем" змясціў месячнік The Anglo-Russian. Там, у Вене, І.Луцкевіч меў магчымасць пазнаёміцца з падыходам да нацыянальнага пытання аўстрыйскіх марксістаў. Як вядома, у аўстрыйскіх уладаннях знаходзілася немалая частка Украіны, і там украінцы мелі значна лепшыя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры і асветы, чым у Расіі. Луцкевіч не мог не выкарыстаць паездку ў Аўстрыю для знаёмства з украінскім рухам і яго дзеячамі. У прыватнасці, ён наладзіў добрыя адносіны з адным са стаўпоў украінства – уніяцкім мітрапалітам Андрэем Шаптыцкім. Ёсць падставы думаць, што тады ж ён сустрэўся з яшчэ адным вялікім украінцам – гісторыкам, а ў 1917–1918 гадах кіраўніком Цэнтральнай Рады Украінскай Народнай Рэспублікі Міхайлам Грушэўскім.

Ужо з канца XIX ст. было зразумела, што ў Расіі выбухне рэвалюцыя. Каб пазбегнуць гэтага і згуртаваць народ вакол трона, царызму патрэбна была малая пераможная вайна. Але расійска-японская вайна, распачатая ў лютым 1904 г., скончылася ў маі 1905-га цусімскай катастрофай. Раней жа, у студзені 1905-га, у Расіі пачалася першая расійская рэвалюцыя.

Беларуская Сацыялістычная Грамада і асабіста Іван Луцкевіч ўзялі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях. Пікам яго дзейнасці ў Менску быў прыезд пад выглядам заказчыка на завод Якабсона. Адтуль гудком ён даў сігнал да пачатку агульнай забастоўкі ў горадзе. БСГ дапамагала расійскім сацыялістам-рэвалюцыянерам рыхтаваць замах на менскага губернатара Паўла Курлова. На сядзібе Луцкевічаў назапашвалася зброя для баявой групы партыі. Усё гэта прыцягнула ўвагу ахранкі да братоў Луцкевічаў. На шчасце, Іван у студзені 1906 г. выехаў па партыйных справах у Вільню, а Антону, які заўважыў, што каля дома круцяцца шпікі, удалося ўцячы з Менска. Ён таксама апынуўся ў Вільні.

У былой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага браты Луцкевічы да 1908 г. мусілі жыць з фальшывымі пашпартамі, часта мяняючы месца жыхарства, а то і зусім начуючы пад небам. Усё гэта падрывала здароўе Івана Луцкевіча, які яшчэ ў піцерскіх "Крестах" трапіў у турэмны шпіталь як сухотнік.

Разам з братамі Луцкевічамі ў Вільню перамясціўся і цэнтр партыйнай дзейнасці. Пачаўся новы перыяд у гісторыі беларускага руху.

У час расійска-японскай вайны і першай рэвалюцыі БСГ стала прызнаным суб'ектам агульнарасійскага рэвалюцыйнага руху, пра што сведчаць запрашэнні яе на канфрэнцыі сацыялістычных, рэвалюцыйных і апазіцыйных партый і арганізацый Расіі, якія праходзілі ў Парыжы (1904), Жэневе (1905) і Фінляндыі (1907). БСГ брала ўдзел у стварэнні Беларускага сялянскага саюза, яе сябры працавалі ў Беларускім саюзе настаўніцкіх семінарыяў, Беларускім настаўніцкім саюзе, у міжпартыйным забастовачаным камітэце ў Менску, у міжпартыйным бюро для каардынацыі працы ў вёсцы, яны арганізоўвалі аграрныя забастоўкі ў розных паветах…

(Заканчэнне на 6-й стар.)

З НАГОДЫ

Вялікі ідэал Івана Луцкевіча

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Аднак гэтага было мала. Востра стаяла пытанне аб партыйнай газеце. І на канферэнцыі БСГ у чэрвені 1906 г. І.Луцкевіч выступіў з прапановай пачаць выпуск газеты БСГ.

Партыі патрэбны быў орган, які б пачаў палітычную асвету народа, спрыяў развіццю культуры і нацыянальнай свядомасці ў працоўных масах, гуртаваў беларускі актыў. Пры абмежаванасці рэсурсаў важна было, каб газета выходзіла стабільна. Першая газета, "Наша Доля", у рэдакцыю якой І.Луцкевіч не ўваходзіў, была для ўлад надта "чырвонай" і таму доўга не праіснавала. Яшчэ да афіцыйнага закрыцця "Нашай Долі" 10 лістапада 1906 г. выйшаў першы нумар газеты "Наша Ніва". Курс гэтай газеты вызначалі сябры Цэнтральнага камітэта БСГ браты Луцкевічы і Аляксандр Уласаў. Інжынер, эканаміст, спецыяліст у галіне мясцовага самакіравання Уласаў стаў афіцыйным рэдактарам-выдаўцом "Нашай Нівы". Антон Луцкевіч і ён былі ў ёй вядучымі публіцыстамі. Пры газеце пачало працаваць выдавецтва "Нашай Нівы", якое выпускала мастацкую і сельскагаспадарчую літаратуру, а таксама беларускія календары ў кніжным фармаце.

З самага пачатку выхад "Нашай Нівы" і кніг у выдавецтве "Нашай Нівы" забяспечваўся амаль выключна Іванам. Знаўца старасветчыны, калекцыянер, ён стаў і камерсантам: рэчы, якія траплялі ў яго рукі і не ўяўлялі каштоўнасці для беларусаў, ён прадаваў іншым калекцыянерам, а атрыманыя сродкі ўкладваў у выдавецкую справу. Ён шукаў і знаходзіў фундатараў беларускага друку і сярод абшарнікаў, і сярод людзей невялікага дастатку. У час новага рэвалюцыйнага ўздыму ўжо стала магчымым заснаваць часопісы "Саха" (для сялян) і "Лучынка" (для падлеткаў і моладзі), рэарганізаваць выдавецтва "Нашай Нівы" ў Беларускае выдавецкае таварыства і задумаць пра часопіс для жанчын.

Каб шырыць беларускую нацыянальную свядомасць і ідэю супрацоўніцтва народаў Беларусі і Літвы сярод тутэйшых палякаў і апалячаных беларусаў ды літоўцаў, БСГ перад выбарамі ў III Дзяржаўную думу наладзіла выпуск газеты Kurjer Krajowy. З 1912 г. у Вільні пачала выходзіць і "Вечерняя газета", якая шырыла беларускую ідэю сярод тутэйшых рускіх і абмаскоўленых беларусаў.

Тут, праўда, трэба зрабіць агаворку, што ў 1906–1913 гг. існавалі і другія беларускі выдавецкі цэнтр. У Пецярбургу пад кіраўніцтвам сябра ЦК БСГ В.Іваноўскага працавала выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша ваконца". А калі над суполкай на кароткі час навісла пагроза, сябар Грамады Антон Грыневіч заснаваў у Піцеры сваё выдавецтва. У час рэвалюцыі Іваноўскі вёў і падпольнае партыйнае выдавецтва "Грамада".

Перыяд, калі выходзіла "Наша Ніва" (1906–1915), увайшоў у гісторыю Беларусі як нашаніўскі. Былі створаны ўмовы для росквіту талентаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Алеся Гаруна, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, дзясяткаў іншых літаратараў.

Меў дачыненне І.Луцкевіч і да заснавання ў 1909 г. беларускага хору і беларускай тэатральнай дружыны. Адміністратарам гэтых калектываў стаў яшчэ адзін сябар ЦК БСГ – Аляксандр Бурбіс. Днём нараджэння сучаснага беларускага тэатра можна лічыць 12 лютага 1910 г., калі драматычная дружына паказала першы спектакль на першай беларускай вечарыне ў Вільні. А праз дзесяць дзён на этнаграфічнай вечарыне, на якой былі прадстаўлены ўсе народы, што жылі ў Паўночна-Заходнім краі, беларускі хор заняў другое месца.

І.Луцкевічу даводзілася шмат ездзіць і кантактаваць з людзьмі рознага паходжання і звання. Як пісаў яго брат Антон, бывалі тыдні, калі пяць дзён з сямі Іван праводзіў у вагоне. А Уласаў дадаваў: жартавалі, што Іван ведае ў твар 10 працэнтаў жыхароў Беларусі. Перад пачаткам Першай сусветнай вайны ён наведаў Пецярбург і Фінляндыю. Маючы слабае здароўе, ён моцна прастудзіўся і, вярнуўшыся, доўга адыходзіў ад хваробы. Можна думаць, што менавіта тады пачаўся незваротны туберкулёзны працэс.

А тым часам сітуацыя вымагала актыўнай дзейнасці. У верасні 1915-га заходнія паветы Беларусі апынуліся пад немцамі. Трэба было, каб нямецкая ўлада не дыскрымінавала беларусаў параўнальна з іншымі народамі краю. І беларусам удалося нямала чаго дамагчыся. Беларуская мова была прызнана мовай школьніцтва нароўні з ідышам, літоўскай і польскай. Каб адчыняць школы, патрэбны былі настаўнікі, бо амаль усіх педагогаў, якія былі ў краі, мабілізавалі ў царскае войска або прымусілі выехаць на ўсход. І ў Вільні адчыніліся Беларускія настаўніцкія курсы, а Луцкевіч стаў адным з лектараў на іх. Быў заснаваны Беларускі клуб – і Луцкевіч стаў яго кіраўніком. Пры клубе пачала працу тэатральная трупа, на чале з акцёрам, рэжысёрам і драматургам Францішкам Аляхновічам, чый уклад у станаўленне беларускага тэатра цяжка пераболышыць. Два разы на тыдзень выходзіла газета "Гоман" – спачатку лацінкай, а потым і кірыліцай.

Палітычную дзейнасць немцы забаранілі, але мелася Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Пад яго прыкрыццём працаваў нелегальны Беларускі народны камітэт (БНК). Іван Луцкевіч з'яўляўся сябрам абедзвюх гэтых інстытуцый. Працаваў працу Віленскі камітэт Грамады, а ў яго складзе была створана аўтаномная Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група, у якую ўвайшлі віленскія рабочыя-беларусы. Іван працаваў у абедзвюх гэтых арганізацыях. І думаў пра будучыню краіны. У згодзе з яўрэйскімі, літоўскімі і польскімі аднадумцамі ён напісаў і ў снежні 1915 г. апублікаваў Універсал Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага. Была праклямавана ідэя адраджэння Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Трохі пазней у БНК была выпрацавана і сёння актуальная ідэя стварэння Балтыйска-Чарнаморскага саюза Беларусі, Латвіі, Літвы і Украіны. Ды падзеі разгорталіся так, што гэтым шляхетным парываням нельга было здзейсніцца.

У 1917-м Германія стварыла рэжым найбольшага спрыяння Польшчы і Літве. А таксама дапамагла бальшавікам у Расіі захапіць у кастрычніку 1917 г. уладу. Пераадольваючы супраціў нямецкіх улад, беларусам удалося скліікаць у студзені 1918 г. канферэнцыю, на якой была створана Беларуская Рада ў Вільні. Калі ж бальшавікі сарвалі мірныя перамовы ў Берасці, а 16 лютага 1918 г. немцы пачалі наступленне на Усходнім фронце, Беларуская Рада абвясціла дзяржаўныя сувязі Беларусі і Расіі разарванымі.

У сакавіку 1918 г. сябрам Беларускай Рады ў Вільні нарэшце ўдалося прыехаць у Менск, дзе ўжо была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка і пачала працаваць Рада БНР. Прыехаўшы ў Менск, віленскія беларусы пераканалі сябраў Рады БНР ад БСГ паставіць пытанне пра незалежнасць Беларусі. У літаратуры маецца сведчанне, што менавіта браты Луцкевічы выступілі ў ролі "ўгаворнікаў". І 25 сакавіка незалежнасць БНР была абвешчана. З гэтага часу ігнараваць беларускі чыннік былым "панам становішча" – Польшчы і Расіі – стала ўжо нельга.

Ведучы палітычную дзейнасць, І.Луцкевіч не забываў і пра навуку. У 1915 г. яму ўдалося выявіць татарскую кнігу "Ай Кітаб", пісаную ў XVI–XVII стст. арабскімі літарамі па-беларуску. Кітабы знаходзілі і раней, але расійскія вучоныя пісалі, што гэта кнігі на «белорусском наречии» рускай мовы. Іван жа даваў вучонаму свету, што кітабы напісаны на беларускай мове. І з таго часу навукоўцы называюць іх кітабамі Луцкевіча. Разам з нямецкім мастацтвазнаўцам Альбертам Іпэлем Луцкевіч наладзіў у 1918 г. у Вільні і Менску першую выстаўку твораў беларускага мастацтва. І з таго часу з'явілася і ў навуковай літаратуры замацавалася само паняцце "беларускае мастацтва".

Яшчэ ў ходзе Беларускай канферэнцыі ў студзені 1918 г. з ініцыятывы І.Луцкевіча была заснавана першая беларуская навуковая ўстанова – Беларускае навуковае таварыства (БНТ) – з музеем і бібліятэкай. Луцкевіч перадаў гэтаму таварыству сваю калекцыю помнікаў старасветчыны, твораў мастацтва і кнігазбор.

І.Луцкевічу належала ідэя зрабіць базай беларускай працы ў Вільні і ўсёй Заходняй Беларусі муры былога базыльянскага манастыра. Там былі размешчаны Беларускі музей і бібліятэка БНТ, там 1 студзеня 1919 г. пачала працаваць Віленская беларуская гімназія. Ідэя адчыніць гімназію ў Вільні таксама належала І.Луцкевічу. Ён жа быў і галоўным рэалізатарам гэтай задумы, і адным з першых выкладчыкаў гімназіі.

А здароўе Іванава ўсё горшала і горшала. І настаў час, калі ён ужо не мог устаць. І толькі тады ён згадзіўся ехаць лячыцца на славуты польскі курорт Закапане. Ехаць сам ён ужо не мог. Яго суправаджалі сябры. У Закапане ён прыехаў 22 чэрвеня 1919 года. І там праз няпоўных два месяцы – 20 жніўня – адышоў у вечнасць.

* * *

Шмат гадоў імя Івана Луцкевіча было ў БССР пад забаронай. Калі ж яго імя і згадвалі, дык толькі з адмоўнымі характарыстыкамі. З такімі ж характарыстыкамі можна было згадваць і Беларускую Сацыялістычную Грамаду, і газету "Наша Ніва", якім Іван аддаў нямала здароўя. На сваё заслужанае месца ў падручніках і навуковых працах яго імя пачало вяртацца толькі на пачатку 1990-х. Тады ж, на пачатку 1990-х, археолагі Міхась Чарняўскі і Міхась Ткачоў выступілі з ініцыятывай аднавіць у Беларусі сацыял-дэмакратычную партыю, якая змагалася б за тое, за што змагаліся І.Луцкевіч і Беларуская Сацыялістычная Грамада: за незалежнасць і дэмакратыю, за роўнасць грамадзян не ў беднасці, а ў багацці.

Цяпер мы жывём у незалежнай дзяржаве, але вельмі злабадзённымі застаюцца праблемы захавання і ўмацавання нашай незалежнасці. Не менш важнымі застаюцца праблемы пабудовы ў нашай краіне дэмакратычнага ладу і пераадолення беднасці нашых грамадзян. Толькі пабудаваўшы сапраўды незалежную дэмакратычную і заможную Беларусь, мы зможам сказаць, што ідэал Івана Луцкевіча, сфармуляваны ў 1903 годзе, увасобіўся ў жыццё.

Ігар БАРЫСАЎ,
старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада).

ПРОЕКТ

Аналогов в Беларуси нет

Что известно о строящемся в Минске офтальмологическом центре

Современный офтальмологический центр республиканского уровня построят неподалеку от площади Бангалор.


